ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 90 к.
„ 3 мес.	2 р. 00 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ЗЬВЯЗДА

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-86
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Аддзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

НЯДЗЕЛЯ 20 красавіка 1930 г. № 92 (3600) Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

13 зьезд КП(б)Б—28-га мая

13-ы зьезд КП(б)Б назначаны на 28-га мая 1930 г.

ПАРАДАК ДНЯ 13-га ЗЬЕЗДУ:

1. Даклад ЦК УсеКП(б).
2. Даклад ЦКК УсеКП(б).
3. Справаздача ЦК КП(б)Б:
   а) Палітычная — т. ГЕЙ.
   б) Арганізацыйная — т. ВАСІЛЕВІЧ.
4. Справаздача Цэнтральнай Рэвізійнай камісіі — т. КРОЛЬ.
5. Справаздача ЦКК-РСІ — т. КАЛНІН.
6. Выкананьне пяцігадовага пляну прамысловасьці — т.т. БЭНЭК, ГРЫСЕВІЧ.
7. Калгасны рух і ўздым сельскае гаспадаркі — т.т. ГАЛАДЗЕД і РАЧЫЦКІ.
8. Задачы прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд — т. РЫЖОЎ.
9. Выбары цэнтральных установ партыі.

Норма прадстаўніцтва: 1) адзін дэлегат з пастаноўчым голасам на 100 членаў партыі і адзін дэлегат з дарадчым голасам на 200 кандыдатаў у члены партыі; 2) звыш паказанае колькасьці дарадчыя галасы прадастаўляцца ня будуць.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Зямляўпарадкаваньне ў цэнтры ўвагі

Палявыя работы разгарнуліся ва ўсіх округах БССР. Наступілі рашаючыя дні веснавой пасеўнай кампаніі. Гутарка ідзе ўжо не аб падрыхтоўцы да сяўбы, не аб папярэдніх мерапрыемствах, а аб непасрэднай арганізацыі палявых работ, аб непасрэднай сяўбе.

У веснавой пасеўнай кампаніі індывідуальны сэктар с.-гаспадаркі ў нас займае пераважнае месца. Пераважную частку пасеўнага пляну павінны выканаць індывідуальныя бядняцкія і серадняцкія гаспадаркі. Ад пасьпяховага ходу с.-г. работ у індывідуальным сэктары ў значнай ступені залежыць агульны баланс яравое сяўбы ў нашай рэспубліцы.

Партыя і савецкі ўрад ня раз зазначалі на патрэбнасьць КАРЭННАГА ПЕРАЛОМУ ў падрыхтоўцы да сяўбы індывідуальнага сэктару. Побач з максымальным узмацненьнем калгасаў, побач з усялякай дапамогай і падтрыманьнем сацыялістычнага сэктару сельскае гаспадаркі, трэба мабілізаваць усе сілы, усе сродкі, усю энэргію, каб ня толькі не дапусьціць недасеву ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, але і поўнасьцю выканаць заданьне ўраду аб ПАШЫРЭНЬНІ пасеўнага кліну.

Мы павінны зьвярнуць увагу ўсёй партыйнай і савецкай грамадзкасьці, што гэтыя важнейшыя партыйныя дырэктывы ў радзе месц не праводзяцца ў жыцьцё. Яшчэ ня зжыта недаацэнка значэньня індывідуальнага сэктару ў с.-г. кампанію гэтага году. Яшчэ няма патрэбнага зруху ў рабоце многіх партыйных і савецкіх арганізацый. Яшчэ існуюць нядбайныя адносіны да патрэб індывідуальных бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак.

Весткі, якія паступаюць з месц, выклікаюць сур'ёзную трывогу. Індывідуальны СЭКТАР ЗНАЧНА АДСТАЕ Ў ТЭМПЕ ПАЛЯВЫХ РАБОТ АД АБАГУЛЕНАГА. У радзе раёнаў узьнікае рэальная пагроза недасеву.

Адным з галоўных тормазаў разгортваньня палявых работ зьяўляецца зямляўпарадчая неразьбярыха, якая ня зьнішчана яшчэ ва многіх мясцох. Цэлы рад тэлеграм з раёнаў гаворыць аб тым, што да гэтага часу яшчэ ня ўсюды закончаны адвод зямель сялянам, якія ня ўступілі ў калгасы.

У такіх раёнах індывідуальнікі ня ведаюць, дзе ім сеяць. Далейшае замарудваньне ў правядзеньні прасьцейшага зямляўпарадкаваньня значна і яго цярпець нельга.

Побач з гэтым трэба зараз-жа, не трацячы ні адной мінуты, палажыць канец перагібам зямляўпарадкаваньня. Мы ў гэтай галіне зьяўляемся сьведкамі раду значных скажэньняў партыйнай лініі. Партыя і ўрад ясна і катэгарычна забаранілі абрэзку індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Адводзячы лепшыя землі калгасам нельга дапускаць пераводу індывідуальнікаў на нездатныя для пасеву землі, калі за межамі калгасаў ёсьць больш выгодныя землі. Гэта пастанова часта парушаецца. Ва ўчарайшым нумары «Зьвязды» чытач азнаёміўся з абураючымі фактамі з гэтай галіны. У Брагінскім раёне, напрыклад, адводзілі ня звыш пяці гэктараў на гаспадарку. У некаторых вёсках зусім не далі дзесяткам бядняцка-серадняцкіх гаспадарак зямель для пасеву. З Мазырскае округі паведамляюць: у вёсцы Яшны, Каменкавіцкага раёну, усім бедняком і серадняком адвялі зусім няпрыгодную для засеву зямлю.

У вёсцы Мацкі, Астрашыцка-Гарадзецкага раёну, калгасам адведзены ўсе гароды і сядзібныя землі індывідуальнікаў.

У Мсьціслаўльскім раёне некаторыя мясцовыя работнікі заяўляюць: «зямлю адвялі калгасам, а там (пад гэтым «там» разумеюць індывідуальнікаў)—хоць трава расьці». І гэта ў той час, калі ў раёне 90 проц. індывідуальных гаспадарак.

Мы маглі бы прывесьці яшчэ рад аналягічных фактаў. Ня цяжка здагадацца, якую вялізную палітычную і гаспадарчую шкоду прыносяць усе гэтыя перагібы і скажэньні партыйнай лініі.

Клясавы вораг прыкладае ўсе сілы, каб сарвець сяўбу, каб проціпаставіць індывідуальнікаў калгасьнікам. Перагібы ў галіне зямляўпарадкаваньня дапамагаюць кулаку ў яго шкодніцкай падрыўной рабоце. Перагібы ствараюць пагрозу сяўбе, пагрозу змычцы рабочае клясы з серадняком.

Таму рашучая бязьлітасная барацьба з гапавацяпамі, унтэр-прышыбеевымі ад зямляўпарадкаваньня—чарговая задача нашых партыйных арганізацый. Партыя з коранем вырве перагібы, якія ставяць пад пагрозу бальшавіцкую сяўбу, каторыя дзейнічаюць на руку праваму ўхілу,—гэтай галоўнай небясьпецы ў сучасны момант.

Зямляўпарадкаваньне — надзвычай важная і адказная задача. Труднасьці яе вырашэньня паглыбляюцца кароткім тэрмінам, які ёсьць у нашым распараджэньні. Не дапускаючы замаруджанасьці, адцягваньняў і адтэрміновак, трэба ўвесь час памятаць аб важнасьці ўліку мясцовых умоў і абстаноўкі. Толькі пры такім падыходзе магчымы добры якасны і колькасны эфэкт прасьцейшага зямляўпарадкаваньня. Імкнучыся адводзіць калгасам клін адным суцэльным масывам, у асобных выпадках, там, дзе гэта дыктуе вострая необходнасьць і мясцовая абстаноўка, магчымы адступленьні ад агульнага правіла і прадастаўленьне яравога кліну калгасу некалькімі кавалкамі.

Калгасы Магілеўшчыны канчаюць воры

Ужо засеяна 5.000 гэкт.

УЗМОЦНІМ ТЭМП ПАЛЯВЫХ РАБОТ У ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ СЭКТАРЫ

САЦСПАБОРНІЦТВАМ УЗЬНІМЕМ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦЬ ПРАЦЫ Ў ЧАСЕ СЯЎБЫ

Самацёк замест кіраўніцтва

Асіпавіцкі раён зусім не падрыхтаваны да сяўбы

Становішча з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы ў **Асіпавіцкім раёне** (Бабруйшчына) надавычай кепскае. Раённыя арганізацыі замест кіраўніцтва падрыхтоўкаю да сяўбы спадзяваліся на самацёк. У выніку, у Асіпавіцкім раёне мы зараз маем рад прарываў на пасеўным фронце.

Насеньне па раёне ачышчана толькі на 50 проц., ня гледзячы на тое, што раён у выстарчальнай колькасьці забясьпечаны збожжаачышчальнымі машынамі. Апошнія ня былі поўнасьцю загружаны, прастойвалі ў вёсках па 5-7 дзён бяз усякай работы. Сельсаветы ачысткай насеньня зусім ня цікавіліся.

21 калгас, які маецца ў раёне, зусім не падрыхтаваны да выхаду ў поле. У большасьці калгасаў адсутнічае нават самая прымітыўная арганізацыя працы. Напрыклад, у калгасе «Новая Зорка» з 47-мі абагуленых коняй, на полі працуе толькі 12, рэшта зусім не выкарыстоўваюцца. Рабочыя брыгады дасюль таксама не арганізаваны. Цягавая сіла ўвесь час трымалася на галодным пайку.

У раёне не хапае 2.700 пудоў аўсу і 900 пудоў сена. Ня гледзячы на такое становішча, ні адна раённая арганізацыя нічога ня робіць, каб стварыць кармавыя фонды ў калгасах.

Насеньнем калгасы забясьпечаны ня больш чым на 70-75 проц. Калгас «Прагрэс» зусім ня мае свайго насеньня. Дагэтуль абменена толькі 35 проц. гатунковага насеньня.

Абураючае становішча са скарыстаньнем крэдытаў, вызначаных для пасеўнай кампаніі. **З 37.000 рублёў**, вызначаных на правядзеньне сяўбы ў раёне, **дагэтуль скарыстана толькі 12.792 руб.** Сродкі на кантрактацыю і рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару цалкам не скарыстаны. Калгасам з 20.700 руб. на пасеўную кампанію выдана **толькі 5.980 руб.**

Аб абслугоўваньні індывідуальнага сэктару і гаварыць ня прыходзіцца. Крэдытнае таварыства зусім яго ігнаруе. **7.000 руб. на крэдытаваньне індывідуальных гаспадарак ляжаць нескарыстанымі.** Таксама не скарыстаны і сродкі на каапэраваньне беднаты ў калгасах.

Замест растлумачальнай работы сярод сялянства аб датэрміновым эвароце крэдытаў, крэдытнае таварыства зьвярнулася да ўсіх найшчыкаў з прапановаю вярнуць у 7-мідзённы тэрмін узятыя пазыкі і адным росчыркам пяра скасавала доўгатэрміновыя пазыкі, якія павінны быць выплачаны толькі праз 3 гады, і стварыла гэтым паніку сярод сялянства.

Кантрактацыяй у раёне амаль ніхто ня цікавіўся. План кантрактацыі выкананы ўсяго на 10 проц. і то толькі ў калгасах. З індывідуальнымі гаспадаркамі дагавары аб кантрактацыі зусім не заключаны.

Вызначэньне яравога кліну індывідуальным гаспадаркам яшчэ ня скончана. Сельсаветы ня прымаюць ніякіх захадаў, каб разьмеркаваць зямлю паміж гаспадаркамі, якія не ўвайшлі ў калгасы.

Новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку і льготах бядняцка-серадняцкім гаспадаркам за выкананьне аграмінімуму не растлумачаны сялянству, таксама як і артыкул т. Сталіна і льготы калгасам.

Дырэктыва СНК БССР аб ільготах калгасьнікам не праведзена ў жыцьцё. Запазычанасьць калгасьнікаў не адтэрмінавана, запазычанасьць за зямляўпарадкаваньне калгасьнікаў таксама не скасавана.

Нарэшце, цікава спыніцца, як у Асіпавіцкім раёне была праведзена генэральная праверка да сяўбы. Ня гледзячы на дырэктывы сакратара ЦК КП(б)Б т. Гея, увага грамадзкасьці раёну ня была сканцэнтравана вакол праверкі. Работа раённых устаноў ня была праверана. Весткі, якія былі пасланы раённай камісіяй па праверцы ў «Зьвязду», **не адпавядаюць сапраўднасьці.** Камісія брала гэтыя весткі ад раённых устаноў, а яны лічбы бралі са столі. Напрыклад, крэдытнае таварыства дало весткі, што крэдыты скарыстаны на 48 проц., а зараз выяўляецца, што толькі—на 34 проц.

Такім чынам, раённыя арганізацыі замест выяўленьня недахопаў і памылак займаліся «очковтирательством». Усё гэта ў выніку прывяло да таго, што зараз раён зусім не падрыхтаваны да сяўбы.

Брыгадзір «Зьвязды» АПЯКІН.

АД РЭДАКЦЫІ: Мы зварачаем увагу Бабруйскага акругкому на паданыя факты і чакаем адпаведных мер.

Засеяна 5.000 гэктараў

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад нашага карэспандэнта).

ПА РАДЗЕ РАЁНАЎ АКРУГІ РАЗГАРНУЛАСЯ МАСАВАЯ СЯЎБА. УЖО ЗАСЕЯНА ЗВЫШ 5.000 ГЭКТ. У БОЛЬШАСЬЦІ КАЛГАСАЎ УЖО КАНЧАЕЦЦА ВОРЫВА.

У ЧЭРЫКАЎСКІМ РАЁНЕ КАЛГАСАМІ ЗАСЕЯНА 880 ГЭКТ., ІНДЫВІДУАЛЬНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ 799. У КЛІМАВІЦКІМ РАЁНЕ КАЛГАСАМІ ЗАСЕЯНА 800 ГЭКТАРАЎ, ІНДЫВІДУАЛЬНЫМІ ГАСПАДАРКАМІ 1.800. У ХОЦІМСКІМ РАЁНЕ КАЛГАСАМІ ЗАСЕЯНА 118 ГЭКТ., ІНДЫВІДУАЛЬНІКАМІ—168.

БЫХАЎСКІ РАЁН АРГАНІЗАВАЎ 3 КОННЫЯ БРЫГАДЫ І ПАСЛАЎ У СЕЛЬСАВЕТЫ НА ДАПАМОГУ КАЛГАСАМ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ БЯДНЯЦКІМ ГАСПАДАРКАМ.

Індывідуальным сэктарам амаль ня цікавяцца

У Мсьціслаўскім раёне 90 проц. індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак знаходзяцца па-за калгасамі. Ня гледзячы на гэта раённыя арганізацыі вельмі мала цікавяцца дапамогай індывідуальнаму сэктару і хутчэйшым адводам зямлі індывідуальнікам. Зямляўпарадкаваньне праводзіцца чыста фармальна, па-бюракратычнаму. У вёсцы Балікеры індывідуальным гаспадаркам адвялі 45-50 гэкт. замест 132 гэкт., якія трэ' было ім выдзеліць паводле нормы.

«Адбіць калгасу, а далей хоць трава не расьці»,—вось як разважаюць некаторыя.

Камітэты сялянскай узаемадапамогі зусім бязьдзейнічаюць. Нічога ня зроблена для ўліку бядняцкіх гаспадарак, якія адчуваюць патрэбу ў насеньні і ў працоўнай дапамозе.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

КАЛГАС «ПРАМЕНЬ СОНЦА». На здымку калгасьніца за узорным гнебы

Выклік членаў калгасу імя Дзяржынскага

Група калгасьнікаў у 10 чалавек калгасу імя Дзяржынскага (Гомельскі раён) пастанавіла добраахвотна працаваць у выхадныя дні на ўвесь час пасеўнай кампаніі і выклікала пасьледаваць іх прыкладу рэшту калгасьнікаў.

Калгас «Бальшавік», гэтага-ж раёну, за тры дні ўзарай 42 гэктары. Пасьля выхаду калгасу ў поле 29 гаспадароў падалі заявы аб уступленьні ў калгас.

БАЛСТ.

САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА ПАЛЁХ

УЗОРНАЯ РАБОТА

Калгас «Чырвоны Кастрычнік», Брагінскага раёну (Гомельшчына), 8-га красавіка арганізаваным шляхам пачаў палявыя работы. У першы-ж дзень выявілася, што калгас зусім падрыхтаваны да сяўбы. Увесь с.-г. інвэнтар, цягавая сіла—усё гэта ў поўнай спраўнасьці.

З ПЕРШАГА-Ж ДНЯ ВОРЫВА Ў КАЛГАСЕ РАЗГАРНУЛАСЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА, 66 АРАТЫХ У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ УЗАРАЛІ 42 ГЭКТ. ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ ПА НОРМЕ 39,6 ГЭКТАРАЎ. На другі дзень 71 араты ЗАМЕСТ ВЫЗНАЧАНЫХ 42,6 ГЭКТ. УЗАРАЛІ 45 ГЭКТ. За першыя два дні сяўбы калгасам засеяна 13½ гэкт. гароху, 27,5 гэкт. вікі і г. д. Ідэя энэргічнай падрыхтоўкі да засеву рэшты культур.

КАЛГАС ЗДАСЬЦЬ ДЗЯРЖАВЕ ТОЛЬКІ АДНАГО ЖЫТА 15.000 ПУД. І ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ СЯЕ[illegible] КРУГЛЫ ГОД.

Пасьля пачатку сяўбы [illegible] калгас вярнуліся 15 гаспадароў, [illegible] яшчэ вышлі з яго. Уся [illegible] сіла разьбіта на паасобныя брыгады [illegible] дзесяткі. Старшыя брыгадзіры [illegible] разгортваюць сацыялістычнае спаборніцтва паміж дзесяткамі.

Калгас за кароткі час [illegible] сталяваў у сябе адкормачны сьвін[illegible], малочную гаспадарку, якая [illegible] 150 кароў. Калгас мае ак[illegible] яшчэ ільнасушыльны завод.

Калгас «Чырвоны Ка[illegible]» зьяўляецца першым у раёне [illegible] сваёй моцнасьці, так і па тэрм[illegible] Кіраўніцтвам калгас зараз зяб[illegible]. Для далейшага разгортваньня [illegible]ніцтва ў калгасе трэба прымацаваць да яго пастаяннага агранома.

П. ПАРОЦКІ.

Энэргічна разгортваюць сяўбу

БАБРУЙСК. (Нат. кар.). КАЛГАСЫ БАБРУЙШЧЫНЫ ЭНЭРГІЧНА РАЗГОРТВАЮЦЬ СЯЎБУ ПАД ЛЕЗУНГАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА. КАМУНА ІМЯ СТАЛІНА (ПАРЫЦКІ РАЁН) УЖО ЗЗАРАЛА 70 ГЭКТ. І ЗАСЯЛА 30 ГЭКТ. АЎСУ. КАЛГАС «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» (ЛЮБАНЬСКІ РАЁН), СВАЯЧАСОВА ПАЧАЎШЫ СЯЎБУ, АДЧУВАЕ НЯСТАЧУ Ў КОНСКАЙ РАБОЧАЙ СІЛЕ. НА ДАПАМОГУ ЯМУ ПЕРАКІНУТЫ ДВА ТРАКТАРЫ З СУСЕДНЯГА САЎГАСУ «САСНЫ». КАЛГАС «СЬВЕТ», БАБРУЙСКІ РАЁН, УЖО ЗАСЕЯЎ 30 ГЭКТ. ЯРАВОГА КЛІНУ. НА СХОДЗЕ КАЛГАСЬНІКІ ВЫКЛІКАЛІ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ДВА СУСЕДНІЯ КАЛГАСЫ НА ЛЕПШАЕ І ХУТЧЭЙШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ. ВЫБРАНЫ ШТАБ КІРАЎНІЦТВА СПАБОРНІЦТВАМ.

У АДКАЗ НА ПАГРОЗЫ КУЛАЦТВА КАЛГАСЬНІКІ З КАЛГАСУ ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА (ПАРЫЦКІ РАЁН) АББЯСЬЦІЛІ СЯБЕ ЎДАРНІКАМІ І ПАСТАНАВІЛІ ДА 20-га КРАСАВІКА ЗАСЕЯЦЬ 30 ГЭКТ. ЯРЫНЫ [illegible] ПОЎНАСЬЦЮ СКО[illegible] ЯРАВОГА КЛІНУ.

ЛІЧЫЦЬ НАС[illegible] ЎДАРНАЙ, ПАШ[illegible] ПЛОШЧУ НА 12 ПРО[illegible] І Ў ТЭРМІН СКО[illegible] ЯРАВУ— УХВАЛІЛІ КАЛГАСЬНІКІ З КАЛГАСУ, «ЧЫРВОНЫ ХЛЕБАРОБ» (СТАРОБІНСКІ РАЁН). СВАЕ ПАСТАНОВЫ КАЛГАСЫ ПРАВОДЗЯЦЬ У ЖЫЦЬЦЁ. РАБОТА ІДЗЕ ПА СУПОЛЬНАЙ ВЫЗНАЧАНЫМ ВЫТВОРЧЫМ ІЛІНІЕ.

А. М.

Ня ведаюць дзе сеяць

Калгасы Дукорскага сельсавету (Менш[illegible]чына) зусім не падрыхтаваны да сяўбы. Дасьць інвэнтар не [illegible]грамантаваны, цягавая сіла не абг[illegible]ена. У сельсавеце яшчэ ня скончана зямляўпарадкаваньне. Ні калгасы, [illegible] індывідуальныя гаспадаркі не [illegible], дзе ім сеяць. Сам сельсавет без [illegible]каморнікаў ня можа справіцца з [illegible] работай.

Г. ФРЫД.

Задачу выканаць у 2-3 дні!

МЕНСКУ, БАБРУЙСКУ І БАРЫСАВУ ЗАРАЗ-ЖА АДГРУЗІЦЬ УВЕСЬ ПОПЕЛ НА МАР'ІНА

Прыцягнуць камсамол да актыўнага ўдзелу ў гэтай справе

У сувязі з невыкананьнем пляну завозу попелу, зрываецца пасеўная кампанія ў камуне імя «БВА» і ў саўгасе імя «Дзесяцігодзьдзя БССР». Гэта тым больш недапушчальна, што і камуна і саўгас зьяўляюцца адзінымі ў СССР буйнымі гаспадаркамі, якія пабудаваны на маліраваным балоце. Адсюль і спэцыфічныя асаблівасьці і трудносьці, якія, на жаль, ня ўлічваюцца нашай грамадзкасьцю. Зямельныя-ж і каапэрацыйныя арганізацыі, па-праўдзе кажучы, часта недапушчаль па нядбайна адносяцца да задаваленьня неадкладных і мінімальных патрэб камуны і саўгасу.

Возьмем хаця-б такі факт, як незабесьпячэньне гэтых гаспадарак попелам, які замяняе калійнае ўгнаеньне.

Замест 175 вагонаў попелу камуна і саўгас атрымалі ўсяго калі 10 вагонаў. Гэта — абураючы факт.

Камуна імя «БВА» і саўгас імя «Дзесяцігодзьдзя БССР» ня выканаюць пляну веснавой сяўбы, калі яны ў бліжэйшыя-ж дні не атрымаюць выстарчальнай колькасьці попелу.

Ці можна зараз што-небудзь зрабіць у гэтай галіне? Можна, калі дзейнічаць хутка і рашуча, калі грамадзкасьць умяшаецца ў гэтую справу.

У Менску, Бабруйску і Барысаве ў скрыцных жактаў і на прадпрыемствах ляжыць вялізная колькасьць сабранага попелу. Паводле вестак, на адным толькі заводзе імя Домбаля, у Барысаве сабрана каля 5.000 пудоў попелу. Пры бліжна такі-ж малюнак і на іншых прадпрыемствах. Прымацаваныя да прадпрыемстваў і жактаў калгасы і саўгасы сваячасова не забралі гэты попел. Ён акрамя таго, больш патрэбен камуне і саўгасу па Мар'іне, чым многім калгасам, якія знаходзяцца паўкола Менску, Бабруйску і Барысава, бо на Мар'іне сеюць выключна на балотнай глебе, бо там праводзіцца досьлед усесаюзнага значэньня. Зусім зразумела, што трэба ўсю наяўную колькасьць попелу ў пералічаных гарадох тэрміновэ адгрузіць камуне імя «БВА» і саўгасу імя «Дзесяцігодзьдзя БССР». Гэта павінна быць зроблена ў бліжэйшыя-ж два - тры тыдні.

Выканаць такую задачу можна толькі пры ўмове мабілізацыі камсамолу ў Менску, Бабруйску і Барысаве, які павінен прымаць непасрэдны ўдзел у выяўленьні попелу ў жактах і на прадпрыемствах, у адгрузцы яго на Мар'іна. Камсамол павінен прасачыць, каб Менскі, Бабруйскі акрпаляводсаюзы, Барысаўскі райпаляводсаюз і ўпоўнаважныя Белсельтрэсту разам з адпаведнымі зямельнымі органамі неадкладна арганізавалі гэтую справу.

Толькі такім шляхам, толькі баявымі метадамі працы можна напярэдадзіць зрыў сяўбы на Мар'іне.

Попел ёсьць. **Ён павінен быць выяўлены і адасланы камуне і саўгасу, што знаходзяцца на Мар'інскім масыве, у бліжэйшыя-ж 2-3 дні.**

Л. Арановіч.

Ад рэдакцыі: Мы чакаем паведамленьня Менскага, Бабруйскага і Барысаўскага камітэтаў ЛКСМБ; Менскага, Бабруйскага і Барысаўскага паляводсаюзаў, веморганаў і ўпоўнаважных Белсельтрэсту аб прынятых тэрміновых мерах да неадкладнай адгрузкі попелу на Мар'іна.

Пляны бальшавіцкай сяўбы будуць выкананы

ЦК КП(б)Б атрымана тэлеграма ад калгасьнікаў «Энгельса», Уваравіцкага раёну (Гомельшчына). У тэлеграме калгасьнікі запэўняюць ЦК, што пляны бальшавіцкай сяўбы будуць імі выкананы.

«Згуртаваўшыся вакол камуністычнай партыі,—заяўляюць яны,—мы замацуем нашы калгасы. Няхай жыве Ленінскі ЦК! Няхай жыве сацыяльная калектывізацыя»!

Пад дымавой заслонай

Інтэрв'ю міністра замежных спраў Польшчы п. Залескага, зьмешчанае ў амэрыканскай газэце «Нью-Ёрк Таймс», прысьвечанае савецка-польскім адносінам, прадстаўляе сабою факт вялікай палітычнай важнасьці.

Савецкая прэса ўвесь час зазначала і зазначае на рост ваенных падрыхтаваньняў з боку польскіх імпэрыялістых. Гэтыя паказаньні і пастаянныя выкрыцьці нашай прэсы былі пацьверджаны апошнімі выступленьнямі правадыра польскай эндэцыі Рамана Дмоўскага. Яго вядомыя артыкулы ў «Газэце Варшаўскай», якія выкрывалі антысавецкія пляны міжнародных капіталістых і фашысцкага ўраду Польшчы, выклікалі вялікі палітычны водгук ва ўсім сьвеце. Частка польскай буржуазнай прэсы, якая сыгналізавала наяўнасьць ваенных плянаў у лягэры пілсудчыкаў, прымушана была адзначыць, што ў самых «шырокіх колах польскай грамадзкасьці» існуюць зусім пэўныя настроі супраць якіх-бы там ні было анты-савецкіх авантур. Эндэцкі «Дзеньнік Віленскі» даволі выразна заяўляў у тым дні, што «для вайны патрэбны ня толькі грошы, але і энтузіязм тых, хто гэту вайну будзе весьці. А гэтага энтузіязму да вайны няма сярод шырокіх мас польскага насельніцтва». Мы добра ведаем, што шырокія працоўныя масы Польшчы вядуць актыўную барацьбу супроць ваенных анты-савецкіх плянаў польскага імпэрыялізму, супроць фашыстаўскай дыктатуры.

Прадстаўнікі польскага ўраду ў асобе міністра замежных спраў прымушаны былі ў выніку трывожных сыгналаў савецкай прэсы, у выніку выступленьняў Дмоўскага, узяць слова па самым кардынальным пытаньні ўсёй унутранай і замежнай палітыкі Польшчы, па пытаньні аб адносінах да Савецкага Саюзу.

Залескі не шкадуючы разбавіў сваё інтэрвью пацыфісцкай вадой. Міністар замежных спраў старанна запэўняе амэрыканскага карэспандэнта, што быццам-бы польскі ўрад «ня хоча ні аднэй пядзі зямлі новай тэрыторыі», што «інтарэсы і імкненьні Польшчы далёкі ад жаданьня парушыць мір Эўропы», што быццам-бы дагавор Польшчы з Нямеччынай «памылкова тлумачыцца трэцяй стараной, як довад, што мы імкнемся забясьпечыць сабе тылы на выпадак магчымай усходняй авантуры».

Але ўсе гэтыя «міралюбівыя» запэўніваньні пана Залескага ня ў стане ўтаіць, аднак, іспаваньня ня толькі анты-савецкіх плянаў, але і канфэрэнцый міжнародных капіталістых, якія адбыліся нядаўна і якія былі прысьвечаны справе барацьбы супроць Савецкага Саюзу. Залескі, зазначаючы на тое, што «трывога ў Расіі» можа быць растлумачана тымі паведамленьнямі, якія былі ў артыкулах газэт аб «спатканьнях капіталістычных лідэраў у Парыжы і інш. мясцох, каторыя быццам-бы рыхтуюць вайну супроць Саветаў», заяўляе: «калі сапраўды і мелі месца падобныя спатканьні, дык у часе іх разглядаліся бадай гандлёвыя крокі, якія неабходна было распачаць супроць сыстэмы дэмпінга, якая ўжываецца Саветамі». Такім чынам, мы маем з боку ўжо **афіцыйнага** прадстаўніка польскага ўраду зусім пядзвуначную заяву аб кроках, якія прымаюцца міжнароднымі імпэрыялістымі, у тым ліку і польскімі, для арганізацыі эканамічнай блёкады Савецкага Саюзу, для спробаў сарваць наш экспарт, для падрыхтоўкі ваеннага паходу супроць краю Саветаў. Невыпадкова таму, што выступленьне Залескага зьмяшчае ў сабе грубыя выпады супроць нашай сыстэмы манаполіі замежнага гандлю і паказаньні на тое, што цэлы рад буржуазных дзяржаў «расчароўваюцца ў Расіі».

Разам з гэтым, інтэрв'ю Залескага ні адным словам не абвяргае канкрэтных паказаньняў **на канкрэтныя факты** ваенных падрыхтаваньняў польскага імпэрыялізму да вайны з Савецкім Саюзам. Няма патрэбы даводзіць, што мэтад, пацыфісцкага ашуканства мас, які ўжываецца буржуазнай дыпляматыяй і які знаходзіць сваё адлюстраваньне і ў гэтым інтэрв'ю, ня ўсыпіць ні на адну мінуту нашай пільнасьці. Калі мы параўнаем поўную адсутнасьць у інтэрв'ю якіх-бы там ні было абвяржэньняў фактаў ваенных падрыхтаваньняў польскага ўраду — з фактычным, адначасна, пацьвярджэньнем іспаваньня міжнародных анты-савецкіх плянаў, дык для нас будзе зусім ясным, што **гэта выступленьне польскага міністра замежных спраў зьяўляецца няўдалай спробай ўсыпленьня шырокіх народных мас Польшчы** і прыкрыцьця актыўнай падрыхтоўкі да вайны, якая ўзмоцнена працягваецца як польскім, так і міжнародным імпэрыялізмам. У гэтых адносінах вельмі цікавы перадавы артыкул «Газэты Варшаўскай» ад 17-га красавіка, які гаворыць аб апошніх артыкулах «Известий», прысьвечаных польска-савецкім адносінам, і адзначае: «Савецкія газэты настойваюць на тым, што Польшчу хочуць прымусіць заяваць пілсудчыкі. Аб гэтым ужо пісалася ў нашай газэце—пішэ «Газэта Варшаўска». Ня будзем варочацца да гэтага пытаньня, але ўсё-ж савецкая прэса павінна прызнаць, **што калі-б нават у Польшчы і была група,** якая думае аб вайне, дык пры цяперашнім стане настрояў і польскае грамадзкае думкі, якая праявілася ў дыскусіі над артыкуламі Дмоўскага, вядзеньне вайны, якое ніхто ня хоча, зьяўляецца абсалютнай немагчымасьцю».

Савецкі ўрад вёў і будзе праводзіць цьвёрдую палітыку міру і нармальных **знанамічных** адносін з краінамі Захаду. Але шырокія масы працоўных нашага краю, падтрымліваючы гэту мірную палітыку свайго ўраду, гатовы па першым закліку абараніць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну ад замахаў міжнародных драпежнікаў. І ніякія іжывыя «пацыфісцкія» выступленьні імпэрыялістых не паслабяць гэтай баявой гатоўнасьці працоўных мас Сав. Саюзу.

На палявых работах ў Меншчыне

Гэтымі днямі вярнуўся з паездкі па некаторых раёнах Меншчыны сакратар Менскага АК КП(б)Б т. **Славінскі.** У гутарцы з нашым супрацоўнікам т. Славінскі падзяліўся сваімі ўражаньнямі з паездкі:

— Я аб'ехаў у апошнія дні,—сказаў ён,—4 раёны Менскай акругі, каб асабіста азнаёміцца са становішчам калектывізацыі, ходам палявых работ і тымі перашкодамі, якія стаяць на шляху правядзеньня сёлетняй веснавой кампаніі.

З прычыны адсутнасьці часу, мне прыйшлося ядоўга затрымлівацца ў Астрашыцка-Гарадзецкім і Лагойскім раёнах. Аднак, асабістыя ўражаньні і матар'ялы, атрыманыя ў мясцовых арганізацыях, даавяляюць зрабіць поўныя вывады аб становішчы гэтых раёнаў.

Ня дрэннае ўражаньне пакідае Астрашыцка-Гарадзецкі раён. Усе калгасы вышлі на работу. Сяўба ў калгасах праходзіць вельмі дружна. Калгасьнікі працуюць з вялікім энтузіязмам. Адліў з калгасаў спыніўся. Тут наглядаецца ня толькі стабілізацыя, але і прыток новых членаў у калектывы. Прыліў, праўда, павольны, але ён ідзе штодзенна і ўсё расьце. У поле выходзяць і індывідуальнікі бедакі і сераднякі. Бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, бязумоўна, засеюць сваю плошчу. Серадняцкая верхавіна ў некаторых мясцох ня схільна пашыраць пасеўную плошчу.

Шырокая растлумачальная кампанія, што разгарнулася ў раёне, бязумоўна, ліквідуе такія настроі некаторай часткі серадняцтва, настроі, якія ні на чым не грунтаваны і зьяўляюцца вынікам падгрунтаваны і зьяўляюцца вынікам падгрунтаваны і зьяўляюцца элемэнтаў. Ва польнай агітацыі вароўных элемэнтаў. Ва ўсялкім выпадку, калгасы і саўгасы заўсёдзь тыя вучасткі, якія ня будуць апрацаваны індывідуальнікамі.

Варта адзначыць, што кіраўніцтва Астрашыцка-Гарадзецкага раёну працуе здавальняюча. Яно добра ведае свае задачы і даволі энэргічна і правільна праводзіць мерапрыемствы партыі.

Інтэрв'ю Залескага

ВАРШАВА, 18-4. Польскі друк зьмяшчае сьпіня інтэрв'ю, дадзенае міністрам замежных спраў Залескім варшаўскаму карэспандэнту газэты «Нью-Ёрк Таймс».

«Інтарэсы і імкненьні Польшчы далёкі ад замераў парушэньня міру ў Эўропе,—кажа Залескі. Праўда, наша спроба заспаваць лепшыя адносіны з Няменчынай намылкова разглядаецца, як доказ, што Польшча хоча забясьпечыць сабе «тыл» на выпадак магчымай авантуры. Цяжка зразумець, што магла-б выйграць Польшча ад такой авантуры.

Мы ня хочам ніводнай пядзі тэрыторыі. Не жадаючы вайны, Польшча робіць усё, каб пашырыць экапамічныя адносіны са сваім усходнім суседам. Ня гледячы на гаспадарчыя цяжкасьці, Польшча дала СССР гарантаваны дзяржаўны крэдыт на многа мільёнаў долярaў. Ці-ж Польшча зрабіла-б так, маючы на ўвазе пачаць вайну з СССР?

Я згодзен, што спатыкаюцца цяжкасьці па пытаньні аб замацаваньні гандлёвае згоды з СССР. Існуюць прыч цыповыя разыходжаньні між сыстэмай капіталістычнага індывідуалізму і дзяржаўнай манаполіі. Іншыя дзяржавы, якія заключылі гандлёвыя дагаворы з Расіяй, расчараваліся, але я веру, што гэту праблему ўзаемаадносін магчыма вырашыць.

Часткова ваенная трывога СССР тлумачыцца, бязумоўна, артыкуламі друку, якія спасылаюцца на мнімых «капіталістычных лідэраў у Парыжы і ягчэ дзесьці, які быццам падрыхтоўваюць вайну з СССР.

Ня веру, каб сур'ёзна капіталісты вялі дыскусію на гэту тэму. Калі сапраўды такія спатканьні і адбыліся, дык хутчэй усяго з мэтай разглядзець мерапрыемствы супроць сыстэмы Дэмпінта, якая, здаецца, падаўна прынята савецкім урадам.

«Зразумела, што ўсё гэта—толькі мае меркаваньні, — кажа далей Залескі. У мяне няма ніякай афіцыйнай інфармацыі аб гэтых спатканьнях.

Ва ўсякім выпадку, незалежна ад таго, што па гэтаму пытаньню гаворыцца, магу толькі паўтарыць ягчэ раз, што Польшча ня прыме ўдзелу ні ў якай ваеннай авантуры і што яна хоча заставацца і ў далейшым фактарам міру і парадку».

Буржуазны друк абгаварвае пытаньне ўзброенага нападу на СССР

«НІ САЛДАТЫ, НІ ПАЛІЦЭЙСКІЯ НЕ ДАПАМАГАЮЦЬ»...

ПРАГА, 14. «Газэта Багемія» (буржуазная) публікуе артыкул аб пяцігодцы над загалоўнам «Паліцыя і кулямёты тут не дапамогуць» «Калі СССР удасца —піша газэта)—хаця бы толькі прыблізна выканаць пастаўленае перад сабой гігантскае заданьне, тады СССР, бязумоўна, зьявіцца бліскучым довадам арганізатарскіх здольнасьцей бальшавікоў, а становішча савецкага рэжыму замацуецца. «Некаторыя дзяржавы з-за балазьні перад рэвалюцыйным рухам пічаць сваёй задачай у якасьці папераджальных мер падрыхтаваць узброены напад на СССР». Сьмешным было-б уяўляць сабе, што давесці толькі выставіць моцную армію, узброеную гарматамі, самалётамі, атрутнымі газамі і інш. «прыемнымі» рэчамі, каб такім шляхам бальшавіцкая небясьпека была зьнішчана. Ні салдаты, ні паліцэйскія не дапамогуць, калі раньце галена, і ўсё новыя пласты сярэдніх кляс пераходзяць на становішча пралетараў». (ТАСС).

Паўстаньне супроць ангельскага імпэрыялізму ў Індыі

ЛЁНДАН, 19. Паводле вестак агенцтва Рэйтэр з Калькуты, у Чыстагонгу (Бэнгальская правінцыя) выбухла "сур'ёзнае паўстаньне. Падрабязнасьцей няма, бо тэлефонныя і тэлеграфныя правады пераразаны. Весткі былі атрыманы па радыё.

ЛЁНДАН, 19. Як тэлеграфуюць з Бамбэю, у Чыстагонгу (буйны горад Бэнгальскай правінцыі) паўстанцы ўчора ўначы напалі на паліцэйскі арсэнал і на чыгуначны вузел. Будынак арсэналу, а таксама рад будынкаў на станцыі разбураны. У часе сутычкі забіты адзін паліцэйскі сэржант і адзін салдат англійдзкіх войск. Сярод паўстанцаў забіта 4 чал. Паўстанцы спынілі тэлеграфную сувязь і разбурылі чыгуначны шлях.

У 40 мілях ад Чыстагонгу, у сувязі з пашкоджаньнем шляху, цягнік зышоў з рэек і такім чынам вайсковыя часьці могуць прыбыць туды толькі заўтра.

Аб падзеях у Чыстагонгу апублікавана Ўрадавае паведамленьне, у якім гаворыцца, што ў нападзе на арсэнал прымала ўдзел каля 100 паўстанцаў. Паводле вестак агенцтва Рэйтэр, сёньня ў Чыстагонгу з самай раніцы разьяжджаюць браніраваныя аўтамабілі. Паліцэйскія атрады занялі ўсе стратэгічныя пункты гораду. Узмоцнена ахоўваецца арсэнал і ўсе фабрыкі зброі. У горадзе адбываюцца павальныя вобыскі. Зроблена шмат арыштаў. (ТАСС).

Савецкая ўлада ў Кітаі пашырае сваю тэрыторыю

ШАНХАЙ, 15. Паводле вестак ханькоўскіх газэт, у Яньсі і Хуанані (на паўночным ўсходзе Хубэі) устаноўлена савецкая улада. Уся зямля была канфіскавана і разьмеркавана паміж сялянамі (ТАСС).

ШАНХАЙ, 2. Рэвалюцыйны рух у Кітаі, які разгортваецца, выклікае моцнае непакоі кітайскага друку. Газэта «Шанхай Гомін-шы-бао» наступным чынам апісвае становішча ў правінцыі Гонень: «Розныя пласты насельніцтва ведьмі церпяць ад бандытаў». масцва на ўвазе сялянскі рух. Мясцовыя войскі ня ў стане аказаць належнага супраціўленьня Чырвонай арміі. Нядаўна быў захоплен Чырвонай арміяй Сзіансэян.

Газэта прызнае, што камуністы ў гэтым павеце зьяўляюцца ведьмі буйнай валічынёй і што шматлікім карным экспэдыцыям не ўдалося іх разьбіць.

Нанкінскія выслаў значныя вайсковыя сілы супроць чырвоных атрадаў

ПЭЙПІН, 18. Мясцовы чужаземны друк знаходзіць, што адпраўка войск з Нанкіна ў раён Ухана (гарады Ханькоу, Ханьян і Ічан у Хубэйскай правінцыі) выклікана, бязумоўна, узмоцненай дзейнасьцю паўстанцкіх атрадаў, якія кіруюцца камуністымі ў Хубэйскай правінцыі

У фашысцкай Польшчы

Хваля масавых арыштаў у Заходняй Беларусі ўзрастае

ВІЛЬНЯ, 19. Масавыя арышты ў Заходняй Беларусі ня спыняюцца, а бязупынна ўзрастаюць. Пастаўлена на ногі ўся дэфэнзыва і паліцыя.

Па ўсёй тэрыторыі Заходняй Беларусі адбыліся тысячы вобыскаў. Сотні арыштаваных.

За апошнія дні дэфэнзыва пашырыла сваю «кампанію» на Піншчыну і Наваградчыну.

Асаблівае заядла «дзейнічае» дэфэнзыва ў прымежных раёнах Заходняй Беларусі. Дэфэнзыва супольна з вайсковай жандармерыяй арыштоўвае бядняцкае насельніцтва літаральна цэлых вёсак.

Віленскі фашысцкі друк інтэнсіўна пашырае правакацыйныя чуткі аб выкрыцьці выдуманых «чырвоных штабаў», «чырвоных гнёздаў», аб арыштах нібы бальшавіцкіх пасланьнікаў і інш.

Уся гэта правакацыйная кампанія польскага фашызму ў Зах. Беларусі знаходзіцца ў цеснай сувязі з падрыхтоўкай да вайны супроць Савецкага Саюзу.

Падрыхтоўка да 1 Мая

ПЕРШАМАЙСКАЯ КАМПАНІЯ ПАВІННА АБЯРНУЦЦА Ў ДЗЕНЬ МАБІЛІЗАЦЫІ МАС

ЛЁНДАН, 11. ЦК ангельскае кампартыі зьвярнуўся да ўсіх акруговых і раённых арганізацый з асобным цыркулярным лістом з поваду падрыхтоўкі і правядзеньня сьвяткаваньня 1-га мая. «Першамайская кампанія,—піша ЦК у сваім лісьце,—павінна абярнуцца ў дзень мабілізацыі мас для барацьбы супроць капіталізму, якая ўсё ўзмацняецца». Таму 1-га мая ў Англіі павінен быць днём арганізаванае барацьбы і дэманстрацыі рабочых разам з беспрацоўнымі, днём барацьбы супроць капіталістычнай рацыяналізацыі, супроць імпэрыялізму, супроць каляніяльнага ўціску, супроць ваеннай небясьпекі, супроць падрыхтоўкі вайны з Савецкім Саюзам і інш.

У цэнтры ўвагі на ўсёй першамайскай кампаніі,—гаворыцца ў лісьце,—павінен быць галодны паход на Лёндан. Кожны мітынг, дзе гэта магчыма, павінен быць мабілізаваны на данамогу галоднаму паходу». (ТАСС).

ПРАЛЕТАРЫЯТ БАЎГАРЫІ ДЗЕЙНА РЫХТУЕЦЦА ДА 1-ГА МАЯ

ВЕНА, 14. Як паведамляюць з Софіі, баўгарскія рэвалюцыйныя арганізацыі, рабочая партыя, незалежныя прафсаюзы і «сэкцыя моладзі» рабочай партыі дзейна рыхтуюцца да 1-га мая. Па ўсім краі за апошнія дні пашыраюцца лятучкі і адозвы. (ТАСС).

ЗА СТВАРЭНЬНЕ 1-ГА МАЯ АДЗІНАГА ФРОНТУ ПРАЦОЎНЫХ

ГЕЛЬСІНГФОРС, 17. Орган левых сацыялістых «Цідонантая» публікуе адозву, якая заклікае рабочых Фінляндыі да стварэньня 1-га мая адзінага фронту працоўных пад пёзунгамі барацьбы супроць беспрацоўя і фашызму і за абарону сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР (ТАСС).

Савецкі экспарт у Нямеччыну пастаўлен пад сур'ёзную пагрозу

БЭРЛІН, 18. Камэнтуючы павышэньне мытных ставак на рад тавараў, што ўводзяцца ў Нямеччыну, орган бэрлінскага гандлёвага прадстаўніцтва піша: «Апошнія стаўкі ў галіне мыт і гаспадарчай палітыкі Нямеччыны адзначаюць ужо ня толькі магчымасьць СКАРАЧЭНЬНЯ САВЕЦКА-НЯМЕЦКАГА ГАНДЛЮ, але і СУР'ЁЗНУЮ НЕБЯСЬПЕКУ ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА РАЗЬВІЦЬЦЯ ГАСПАДАРЧЫХ АДНОСІН ПАМІЖ НЯМЕЧЧЫНАЙ І СССР. Новыя мерапрыемствы ў Нямеччыне наўрад-ці могуць быць узгоднены з савецка-нямецкай эканамічнай умовай. Большасьць павышаных мыт, якія ўводзяцца, наносяць у першую чаргу удар па савецкім экспарце ў Нямеччыну. Амаль усе прадметы савецкага экспарту абкладаюцца павышаным мытам. Трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу і на той факт, што гэтыя ўмовы пагражаюць і гандлю самой Нямеччыны з краінамі, экспартуючымі с.-г. прадукты, і ў першую чаргу—Савецкім Саюзам.

Адначасова орган гандлёвага прадстаўніцтва падае вынікі савецка-нямецкага гандлёвага звароту за першае паўгодзьдзе бягучага гаспадарчага году. Увесь гандлёвы зварот паміж абодвыма краямі за гэтыя 6 месяцаў вызначаецца ў суме 263 мільёна руб., г. зн. павялічыўся на 10 проц. супроць першага паўгодзьдзя мінулага году. Але ў той час, як сума савецкіх закупак у Нямеччыне павялічылася на 37 проц.—савецкі экспарт у Нямеччыну зьменшыўся на тры мільёны руб. і склаў за паўгода 157 млн. руб. Пры гэтым сумэ савецкіх заказаў у Нямеччыне ўзрастала штомесяц. Лічбы савецкага экспарту ў Нямеччыну вызвілі тэндэнцыю да зьнижэньня. Орган гандлёвага прадстаўніцтва паказвае, што для ўсіх, хто ведае ўмовы савецкай гаспадаркі, ясна, што гэта ня прыняючае разьвіцьцё савецкага экспарту ў Нямеччыну падрывае існуючыя магчымасьці пашырэньня савецкіх закупак у Нямеччыне, якія і так ужо знаходзяцца пад ударам, з прычыны памянёных вышэй гандлёва-палітычных фактараў.

БОЙ БЕСПРАЦОЎНЫХ З ПАЛІЦЫЯЙ У ЗАВЕРЦЕ

2 РАБОЧЫХ ЗАБІТА І 19 ПАРАНЕНА

ВАРШАВА, 19. У Заверцы (Дамброўскі басэйн) адбыліся сур'ёзныя выступленьні беспрацоўных, якія скончыліся крывавымі сутычкамі. Беспрацоўныя, даведаўшыся, што магістрат (гарадзкое самакіраўніцтва) асигнаваў мізэрныя да сьмешнага сродкі для аказаньня дапамогі беспрацоўным, пік якіх даходзіць да 8.000, занялі будынак магістрата і разбурылі ў ім усю абстаноўку. Прыбыўшай паліцыі беспрацоўныя аказалі жорсткае супраціўленьне і сустрэлі яе градам каменьняў. Бой беспрацоўных з паліцыяй працягваўся некалькі гадзін. «Экспрэс Паранны» піша, што ў часе сутычак двох беспрацоўных было забіта і 19 чал. параненя. Сярод паліцэйскіх—6 параненых. Як паведамляе мясцовы друк, пры задушэньні выступленьня беспрацоўных прымалі ўдзел і вайсковыя часьці.

РАБОЧЫЯ САРВАЛІ АНТЫСАВЕЦКІ МІТЫНГ

ВАРШАВА, 19. У раёне верхне-сілескіх заводаў Круглевска Гута рабочыя сарвалі антысавецкі мітынг, арганізаваны антыбальшавіцкай лігай. Паліцыя арыштавала некалькіх рабочых. (ТАСС).

40-ТЫСЯЧНАЯ АРМІЯ БЕСПРАЦОЎНЫХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

ВАРШАВА, 18. У сувязі з увядзеньнем «сыстэмы эканоміі» па чыгунках звольнена каля 4.000 рабочых. Паводле падліку «Роботніка», зараз налічваецца каля 40.000 беспрацоўных чыгуначнікаў. Аб застоі на чыгунках сьведчыць той факт, што 50.000 вагонаў і адпаведная колькасьць паравозаў не эксплёатуецца. (ТАСС).

АНГЕЛЬСКІЯ ВАЙСКОВЫЯ ІНСТРУКТАРЫ Ў ВАРШАВЕ

ВАРШАВА, 14. У Варшаву прыехалі два ангельскіх вайсковых лётніка капітаны Эльвуд і Кнакер. Лётнікі вывучаюць пастаноўку ваеннай авіяцыі ў Польшчы.

БЕСТЭРМІНОВАЯ КАТАРГА ЗА СПРОБУ «ДЭЗЭРТАВАЦЬ» У СССР

ВІЙНА, 14. Паводле вестак «Унівэрсул», трох салдат гарнізону ў Браіле (Румынія) за спробу «дэзэртаваць» (паводле цьвердаваньня суду, у Савецкі Саюз) засуджаны вайсковым судом у Бухарэсьце да бестэрміновых катаржных работ. (ТАСС).

ПРЫСУД НАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ САЛДАТАМІ

ПАРЫЖ, 18. Страсбургскі суд вынес прыгавар па справе пяці салдат артылерыйскага палка і двух страсбургскіх рабочых, якія абвінавачваліся ў антымілітарыстцкай прапагандзе. Суд прыгаварыў рабочага камсамольца Бурдон да 3-х год турмы і 1.000 франкаў штрафу, а ўсіх іншых падсудных да месяцаў. (ТАСС).

Па Савецкім Саюзе

Планы выконваюцца з перавышэньнем

На 10 красавіка 91 МТС, якія працуюць на Паўночным Каўказе, у Волзе, засеялі 546.000 гэктараў раньніх культур і 20.000 гэктараў позных ярых, што складае 93 проц. заданьня. Найбольшая плошча ў 300 гэктараў працавала 26 станцыямі Паўночнага Каўказу, затым ідзе ЦЧО —120.000 гэктараў і Украіна—108.000 гэктараў.

ХЕРСОН. Пасьля дажджоў, якія ішлі некалькі дзён, установілася цёплае надвор'е, якое вельмі спрыяе сяўбе. Капгасы акругі ўжо засеялі 369.480 гэктараў.

ЛЕНІНГРАД. Работы на ворыве ў сувязі з цёплым надвор'ем пасунулся на ўсіх акругах вобласьці. У паўднёвых раёнах вобласьці пачалася ўжо сяўба.

У Крыме закончылі сяўбу калосавых дзесяць каапэрацыйных МТС. Плян выкананы з перавышэньнем: замест вызначаных паводле пляну 100.393 гэкт. засеяна 106.224 гэкт. Прыступлена да сяўбы прапашных. На 10 красавіка засеяна кукурузы—3.462 гэкт., слапэчніку—725 гэкт., тэхнічных культур—1.159 гэкт., кормаў—400 гэкт., усяго 5.686 гэкт. Плян выкананы на 20 проц. Сяўба прапашных працягваецца.

Шкурынская каапэрацыйная МТС сяўбу пачала 20 сакавіка. Плян засеву выкананы на 105 проц. Працуюць 87 трактароў.

Фомінка-Сьвячніцкая МТС, якая пачала сяўбу 20 сакавіка, засеяла 15.190 гэктараў.

Каапэрацыйныя МТС Немрэспублікі засялі 16.293 гэкт. Плян пасеву выкананы на 50 проц. У паўднёвых раёнах сяўба заканчваецца.

У ЦЧО на 12 красавіка ў полі працавала 22 каапэрацыйныя МТС. Імі заворана 7.754 гэкт., прадыскавана 1.706 гэкт., забаранавана 37.790 гэкт. і засеяна 22.759 гэктараў.

У Казакскім раёне каапэрацыйныя МТС сяўбу пачалі 9 красавіка, МТС Уральская і Петрапаўлаўскай акруг да сяўбы гатовы. Трактарны і прычынны інвэнтар поўнасьцю адраманцаваны; кадрамі і гаручым забасьпечаны.

З Самары тэлеграфуюць: МТС Сярэдняволгі пачалі сяўбу. Лабазінская каапэрацыйная МТС выехала ў поле 5 красавіка. У складзе 43 трактароў. Да 10-га красавіка было забаранавана 1.800 гэкт., засеяна 398 гэкт. Пачалася сяўба ў 8 калгасах Глушыцкага раёну. Такія-ж весткі паступаюць з Вольска-Глушыцкага, Бузулукскага, Андрэяўскага, Самарскага раёнаў. МТС да сяўбы падрыхтаваны.

СУД НАД ШПІЁНАМІ І ШКОДНІКАМІ Т-ВА «ЛЕНА-ГОЛЬДФІЛЬДС»

МАСКВА, 18. 18-га ў крымінальна-судовай калегіі Вярхоўнага суду СССР распачалася слуханьнем справа служачых таварыства «Лена-Гольдфільдс» К. Д. Капясьнікава, Н. М. Мурамскага, Л. Я. Рабава-дэ-Рыбон і служачага камбінату «Рызэр-Цунг» А. А. Баўкіркага, абвінавачваемых у шпіянажы і шкодніцтве. (ТАСС).

Партыйнае будаўніцтва

ПЕРАВЫБАРЫ ІДУЦЬ

ВЫПРАВІЦЬ ХІБЫ І ПАМЫЛКІ

У ЛЕЛЬЧЫЦКІМ раёне справаздачна-перавыбарчая кампанія сарвана. Рад парткалектываў БАРЫСАЎСКАЙ арганізацыі не правялі ніякай падрыхтоўкі. МАЗЫРСКІ АК скасаваў перавыбары на камбінаце. Скажэньне партлініі пры правядзеньні перавыбараў у ячэйцы ЦСУ БССР.

ЗАБЫЛІ аб БАРАЦЬБЕ З ПРАВЫМ УХІЛАМ

(МЕНШЧЫНА)

Зьмена партыйнага кіраўніцтва ў Грэскім раёне ўнесла значны пералом у работу раённай партарганізацыі. Справаздачна - перавыбарчыя сходы ячэек у асноўным праходзяць актыўна, пад знакам рашучага выпраўленьня дапушчаных памылак.

Перавыбарчыя сходы паказалі, што многія партыйныя ячэйкі ў сваёй практычнай рабоце скажалі партыйную лінію. Напрыклад, Пакрышаўская ячэйка груба ігнаравала дырэктыву партыі аб рабоце сярод батрацтва і беднаты. Асобныя члены ячэйкі адкрыта заяўлялі, што «ня трэба з гэтай галотай праводзіць работы». Сваю работу па калектывізацыі ячэйка праводзіла ў адміністрацыйным парадку. Пры арганізацыі калгасу ячэйка груба парушыла прынцыпы добраахвотнасьці.

Перавыбары ў Шышчыцкай ячэйцы паказалі, што ў ячэйцы няма самакрытыкі. Партыйцы заціскалі самакрытыку. З прычыны заціску ў часе чысткі савецкага апарату, беднякі і сераднякі баяліся выступаць з крытыкай і выкрываць канкрэтныя недахопы. У сваёй рабоце ячэйка праводзіла яўна правааапартуністычную лінію. Напрыклад, шышчыцкія партыйцы вельмі прыхільна адносіліся да кулакоў. Яны дапускалі прыём кулацкіх элемэнтаў у калгасы.

Ячэйка калгасу «Чырвоны Маяк», як паказалі перавыбары, праяўляла недапушчальную пасыўнасьць у рабоце сярод батрацтва і беднаты. Увесь час ячэйка нічога не рабіла, каб згуртаваць батрацка - бядняцкае ядро. Ня дзіва, што зараз многія беднякі выйшлі з калгасу.

Трэба канстатаваць, што асноўная маса ячэек па-бальшавіцку прызнала свае памылкі. Гэтыя ячэйкі скарыстоўваюць перавыбары для выпраўленьня дапушчаных памылак і вызначэньня канкрэтных мер па ўзмацненьні сваёй работы.

Выключэньнем зьяўляецца Першамайская ячэйка. Тут перавыбары былі зусім змазаны. Ячэйка моўчкі абыйшла важнейшыя палітычныя задачы. На перавыбарчым сходзе нічога не гаварылася аб барацьбе з правым і «левым» апартунізмам, аб выпраўленьні перагібаў і скрыўленьні партлініі ў калгасным будаўніцтве, аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і г. д. Тое, што ячэйка забыла аб барацьбе з правым ухілам, тым больш дзіўна, што паасобныя члены ячэйкі ня раз выступалі з махровымі праваапартуністычнымі поглядамі. Бясспрэчна, перавыбары ў Першамайскай парт'ячэйцы павінны быць скасаваны.

Я. І—н.

ПЕРАВЫБАРЫ па СЬПІСАХ

(МАЗЫРШЧЫНА)

Справаздачна - перавыбарчая кампанія ячэек па Лельчыцкім раёне сарвана. Ні адна партыйная ячэйка не правяла адпаведнай падрыхтоўчай работы. Ячэйкі не прапрацавалі дырэктыўнага лісту ЦК КП(б)Б аб справаздачна - перавыбарчай кампаніі. Справаздачна - перавыбарчыя сходы ячэек у Лельчыцкім раёне прайшлі суха, казённа, бяз усялякага ўдзелу батрацтва і бядняцка - серадняцкіх мас. Большасьць сходаў прайшла без абмеркаваньня асноўных пытаньняў партыйнай работы на вёсцы. У ходзе перавыбараў у паасобных ячэйках былі дапушчаны грубыя скрыўленьні дырэктыў ЦК аб самакрытыцы і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі.

У прыватнасьці трэба спыніцца на правядзеньні перавыбараў у Лельчыцкай местачковай парт'ячэйцы. Прадстаўнікі райкому, якія праводзілі перавыбарчы сход, напэўна лічылі, што іх не закранае наступная дырэктыва ЦК: «перавыбары праводзіць пры самым строгім захаваньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, пры самым шырокім абмеркаваньні паасобных кандыдатур з абавязковым пэрсанальным (а не па сьпісах) галасаваньнем».

Член РК Шчапятнёў і кандыдат райкому Шарында раней, чым прыступіць да перавыбараў, склалі сьпіс кандыдатаў у новае бюро. Яны загадзя ўмовіліся, каго трэба абавязкова правесьці ў новы склад бюро ячэйкі. Такім чынам, пад націскам у бюро былі выбраны Журамскі, Равуцкі і інш. Гэтыя партыйцы па сваёй ранейшай рабоце цэлкам не аправдалі сябе. Журамскі быў зьняты з работы ў раённым камітэце, як скампрамэтаваўшы сябе работнік. Равуцкі, працуючы ў старым складзе бюро, ня прымаў літаральна ніякага ўдзелу ў рабоце парт'ячэйкі.

Такія перавыбары трэба скасаваць.

Я. К.

Савецкі экспарт у Нямеччыну пастаўлен пад сур'ёзную пагрозу

БЭРЛІН, 18. Камэнтуючы павышэньне мытных ставак на рад тавараў, што ўводзяцца ў Нямеччыну, орган бэрлінскага гандлёвага прадстаўніцтва піша: «Апошнія стаўкі ў галіне мыт і гаспадарчай палітыкі Нямеччыны адзначаюць ужо ня толькі магчымасьць СКАРАЧЭНЬНЯ САВЕЦКА-НЯМЕЦКАГА ГАНДЛЮ, але і СУР'ЁЗНУЮ НЕБЯСЬПЕКУ ДЛЯ ДАЛЕЙШАГА РАЗЬВІЦЬЦЯ ГАСПАДАРЧЫХ АДНОСІН ПАМІЖ НЯМЕЧЧЫНАЙ І СССР. Новыя мерапрыемствы ў Нямеччыне наўрад-ці могуць быць узгоднены з савецка-нямецкай эканамічнай умовай. Большасьць павышаных мыт, якія ўводзяцца, наносяць у першую чаргу удар па савецкім экспарце ў Нямеччыну. Амаль усе прадметы савецкага экспарту абкладаюцца павышаным мытам. Трэба зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу і на той факт, што гэтыя ўмовы пагражаюць і гандлю самой Нямеччыны з краінамі, экспартуючымі с.-г. прадукты, і ў першую чаргу—Савецкім Саюзам.

Адначасова орган гандлёвага прадстаўніцтва падае вынікі савецка-нямецкага гандлёвага звароту за першае паўгодзьдзе бягучага гаспадарчага году. Увесь гандлёвы зварот паміж абодвыма краямі за гэтыя 6 месяцаў вызначаецца ў суме 263 мільёна руб., г. зн. павялічыўся на 10 проц. супроць першага паўгодзьдзя мінулага году. Але ў той час, як сума савецкіх закупак у Нямеччыне павялічылася на 37 проц.—савецкі экспарт у Нямеччыну зьменшыўся на тры мільёны руб. і склаў за паўгода 157 млн. руб. Пры гэтым сумэ савецкіх заказаў у Нямеччыне ўзрастала штомесяц. Лічбы савецкага экспарту ў Нямеччыну вызвілі тэндэнцыю да зьнижэньня. Орган гандлёвага прадстаўніцтва паказвае, што для ўсіх, хто ведае ўмовы савецкай гаспадаркі, ясна, што гэта ня прыняючае разьвіцьцё савецкага экспарту ў Нямеччыну падрывае існуючыя магчымасьці пашырэньня савецкіх закупак у Нямеччыне, якія і так ужо знаходзяцца пад ударам, з прычыны памянёных вышэй гандлёва-палітычных фактараў.

СКАСАВАНЫ

Нядаўна «Зьвязда» ў артыкуле «Скасаваць» паведамляла аб грубым парушэньні партлініі пры правядзеньні перавыбараў бюро ячэйкі прадпрыемстваў Мазырскага камбінату. Бюро партыйнай ячэйкі пальцам не паварушыла, каб правесьці якую-небудзь падрыхтоўчую работу. Зусім ня дзіва, што на перавыбарчым сходзе ня было беспартыйных рабочых. На сходзе менш за ўсё гаварылі аб прамфінпляне, між тым, на прадпрыемствах камбінату з выкананьнем прамфінпляну справа стаіць вельмі дрэнна. Сакратар ячэйкі ў сваім справаздачным дакладзе нічога не сказаў аб тым, што зрабіла бюро па выкананьні прамфінпляну, па калектывізацыі, па ўдзеле ў веснавой сяўбе і г. д.

Мазырскі акруговы камітэт партыі расьсьледаваў факты, паданыя ў заметцы. Расьсьледваньне паказала, што заметка зьяўляецца цалкам і поўнасьцю правільнай. Мазырскі АК скасаваў перавыбары бюро ячэйкі. У ячэйцы праведзены паўторныя перавыбары. Пасьля правядзеньня паўторных перавыбараў бюро акруговага камітэту заслухала даклад аб рабоце ячэйкі камбінату. Ва ўхваленай рэзалюцыі бюро Мазырскага АК КП(б)Б прапанавала ячэйцы неадкладна ўзмацніць сваю работу.

В.

УРОК НЯ ЎЛІЧАН

Перавыбары бюро ў ячэйцы ЦСУ БССР прайшлі настолькі дрэнна, што Фрунзаўскаму РК КП(б)Б прышлося іх скасаваць. Старому складу бюро было абвешчана вымова. Але гэтага ўроку бюро ячэйкі ня ўлічыла. Да паўторных перавыбараў не праводзілася ніякай падрыхтоўчай работы. Толькі за дзень да перавыбараў сакратар паведаміў ва ўстанове ўсім супрацоўнікам аб тым, што заўтра адбудуцца паўторныя перавыбары бюро. У насьценнай газэце ня было ні аднэй заметкі аб перавыбарах.

Ня дзіва, што на перавыбарчым сходзе было зусім мала як партыйцаў, так і беспартыйных. Але гэта ягчэ ня ўсё. Пры правядзеньні сходаў паасобныя члены бюро імкніліся заціснуць самакрытыку. Таварышоў, якія выступілі з правільнай крытыкай дзейнасьці бюро, далікатна асядзілі. Такія спробы мелі месца з боку членаў бюро Сяўчука і Чартока. Сяўчук, напрыклад, стараўна імкнуўся змазаць пытаньне аб бязьдзейнасьці бюро, а партыйцаў, якія выступілі з рэзкай і правільнай крытыкай, ён абвінаваціў у дзяляцтве. У сваіх спробах заціснуць самакрытыку Сяўчук і Чарток пайшлі на свавалаўлым манаўр. Усім камуністым, якія выступілі: «бюро крытыкуюце, а што-ж вы самі зрабілі?».

Нарэшце, перавыбары былі зусім сарваны. Прэзыдыум сходу над канцэрваны. Прэзыдыум сходу над канцэрваны. Прэзыдыум сходу над канцэр

„25-цітысячнікі“ слаба інструктуюцца

Не затрымліваць заработнай платы

З розных раёнаў БССР паступае шмат скаргаў аб тым, што рабочыя «25-цітысячнікі», якія накіраваны па работу ў калгасы, не забясьпечваюцца пэнсіяй, ні досыць інструктуюцца мясцовымі арганізацыямі і г. д.

У Белкалгасцэнтры нашаму супрацоўніку паконт гэтага паведамілі наступнае:

— Яшчэ месяц таму назад Белкалгасцэнтр разаслаў усім акркалгассаюзам спэцыяльны абежнік па пытаньні аб забесьпячэньні «25-цітысячнікаў». У абежніку зазначалася, што, ня гледзячы на частыя дырэктывы Белкалгасцэнтру, а таксама на спэцыяльнае распараджэньне ВСНГБ, Наркампрацы, ЦСПСБ, па мясцох ня прымаюцца рашучыя меры для акуратнай выплаты рабочым «25-цітысячнікам» пэнсіі. Асабліва такое становішча наглядалася ў Аршанскай, Менскай і Бабруйскай акругах, дзе акруговыя калгассаюзы амаль зусім не клапаціліся аб забесьпячэньні рабочых. З боку прадпрыемстваў, якія вылучылі рабочых на работу ў калгасы, наглядаецца маруднасьць у дасылцы пэнсіі «25-цітысячнікам».

Гэтыя факты ўпартага невыкананьня дырэктыў вышэйшых органаў зьяўляюцца зрывам важнейшых палітычных мерапрыемстваў. Белкалгасцэнтр катэгарычна прапанаваў, пад асабістую адказнасьць старшынь акркалгассаюзаў, прыняць усе меры да зжыцьця гэтых ненармальных зьявішч.

Асабліва непаразуменьні выклікае тое становішча, што калгасы, якія нядаўна арганізаваліся і яшчэ ня маюць сродкаў, зусім ня плацяць пэнсіі рабочым «25-цітысячнікам». Між тым, Белкалгасцэнтр у вышэйпаказаным абежніку даў яснае вызначэньне, што ў такіх выпадках галінныя сыстэмы (райпаляводсаюз, раймалжывсаюз, райкалгассаюз і г. д.) павінны адпусьціць патрэбныя сродкі сваёй пізавой сетцы для выплаты пэнсіі рабочым «25-цітысячнікам». Разьлікі з пізавой сеткай раённыя калгассаюзы змогуць зрабіць пасьля эканамічнага ўзмацненьня таго ці іншага калгасу.

Белкалгасцэнтр запрапанаваў акркалгассаюзам у 3-хдзённы тэрмін зьвязацца з прадпрыемствамі, якія камандыравалі рабочых на работу ў калгасы, і праверыць, як гэтыя прадпрыемствы выплачваюць рабочым розьніцу паміж пэнсіяй, якую яны атрымліваюць у калгасе, і сярэднім заработкам на ранейшай рабоце. Гэту розьніцу прадпрыемствы павінны пасылаць рабочым 1-га і 15-га кожнага месяца ў часе выплаты зарплаты.

Усе калгасы, куставыя аб'яднаньні і райкалгассаюзы абавязаны выплачваць акуратна пэнсію «25-цітысячнікам», прычым мінімальны разьмер пэнсіі вызначаны ў 25-30 руб. (калгасы ў залежнасьці ад магчымасьцяй могуць гэту пэнсію павялічыць).

Зараз трэба яшчэ раз праверыць, як выконваюцца дырэктывы вышэйшых органаў у адносінах да матар'яльнага забесьпячэньня рабочых «25-цітысячнікаў». Трэба дабіцца, каб рабочыя, якія адраваны ад сваёй непасрэднай работы на прадпрыемстве і пасланы на работу ў калгас, былі поўнасьцю забясьпечаны як сваім сярэднім заработкам, так і кватэрай і інш.

Трэба таксама праверыць, як інструктуюцца рабочыя «25-цітысячнікі» і як яны скарыстоўваюцца мясцовымі арганізацыямі.

С. Г.

Як працуюць рабочыя ў калгасах

Паводле даных Белкалгасцэнтру, на сёньняшні дзень у калгасах БССР працуе 615 рабочых, вылучаных прадпрыемствамі ў лік «25 тысяч».

Як скарыстоўваюцца гэтыя рабочыя? Вось лічбы:

Рабочыя размеркаваны на работу ў буйных калгасах, у куставых аб'яднаньнях, у машына-трактарных станцыях, машына-трактарных і машына-конных калёнах, у райкалгассаюзах, райсаюзах, с.-г. каапэрацыі і г. д.

У якасьці старшынь праўленьняў буйных калгасаў працуе 327 чалавек, у тым ліку 12 жанчын, членаў праўленьняў калгасаў — 75 чал. (у тым ліку—9 жанчын), партпалітасьветных працаўнікоў — 13 чал., культурна-бытавых працаўнікоў — 14, загадчыкаў гаспадаркаю — 2 чал.

У куставых аб'яднаньнях у якасьці старшынь праўленьняў працуе 57 чалавек (у тым ліку адна жанчына), членаў праўленьняў—14 чал. (жанчын—3), загадчыка трактарнага атраду—1 і інструктарам-арганізатарам—адна жанчына.

У машына-трактарных станцыях, машына-трактарных і машына-конных калёнах працуюць у якасьці загадчыкаў і памесьнікаў загадчыкаў — два чал., загадчыкамі майстэрань—2 чал.

У райкалгассаюзах і раённых саюзах с.-г. каапэрацыі працуе ў якасьці старшынь 17 чал. (жанчын—3), членаў праўленьняў—57 чал. (жанчын—7), загадчыкаў аддзелаў—2, партпалітпрацаўнікоў—3, культурна-бытавых працаўнікоў — 4.

У акруговых калгассаюзах у якасьці членаў праўленьня працуе 6 чалавек, у якасьці інструктароў—4.

Да сельска-гаспадарчага будаўніцтва не падрыхтаваліся

Белкалгасбуд — новая арганізацыя, якая сёлета ўпершыню павінна разгарнуць работу па абслугоўваньні будаўніцтвам сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Плянам Белкалгасбуду прадугледжваецца выкананьне работ у бягучым сэзоне на суму 10 мільёнаў рублёў. З іх па лініі саўгасаў — на 3 мільёны рублёў і па лініі калгасаў і сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі — 7 мільёнаў рублёў. Вызначана набудова 12-ці прыгарадных малочных фэрм, 5 новых крухмальных заводаў, машына-трактарная станцыя ў Койданаве, кантрольна-ветэрынарнага пункту ў Полацку, раду малочных заводаў і інш. З агульнай сумы 2.000.000 руб. прыпадае на арганізацыю водазабесьпячэньня ў калгасах і саўгасах.

Ня гледзячы на такую значную праграму работ, падрыхтоўка да будаўніцтва ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі праведзена нездавальняюча. Ёсьць нават пагроза зрыву раду аб'ектаў работ.

Пачнем з праектаваньня. Толькі 66 проц. работ маюць праекты. Дасюль няма праектаў па цэнтральных малочных у Віцебску, Магілеве, Гомелі, на ільназаводзе, 3-х млынох і г. д. Справа ўскладняецца яшчэ тым, што ў аграіндустрыяльных камбінатах не праведзена пляніроўка і невядома дзе будаваць прадпрыемствы. Асабліва адстаюць у падачы праектаў сыстэмы малочна-жывёлагадоўчай і паляводчай каапэрацыі.

У зьвязку з адсутнасьцю праектаў магчыма, што набудова раду прадпрыемстваў будзе перанесена на другую чаргу ці, нават, на будучы сэзон.

Яшчэ горш справа з рабочымі чарцяжамі і каштарысамі, якіх маецца ў наяўнасьці ня больш 20-25 проц., што ў значнай ступені перашкаджае пачатку будаўнічых работ.

Як з будаўнічымі матар'яламі? Пры ўмове нават выкананьня Белсельтрэстам сваёй заяўкі, будаўніцтва ў саўгасах будзе забясьпечана матар'ялямі толькі на 50 проц. Становішча з будаўнічымі матар'ялямі на іншых арганізацыях можна ахарактарызаваць як вельмі вострае. Сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі павінны былі да пачатку сэзону падвезьці матар'ялы да месца работ, але, ў зьвязку з адсутнасьцю праектаў і вызначэньня месца набудоў, матар'ялы не падвозяцца.

Дагэтуль Наркамзем БССР не ўстанавіў яшчэ фонду дэфіцытных матар'ялаў для сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі. Гэты фонд трэба атрымаць ад Наркамзему СССР.

На работах Белкалгасбуду павінна быць занята сёлета 5.000 рабочых. Значную частку рабочых абавязаны даць калгасы. Але Белкалгасбуд ня ўпэўнены ў тым, ці дадуць калгасы гэтых рабочых. Наогул, у пытаньні з забесьпячэньнем будаўніцтва рабочай сілай — блытаніна і неясьнасьць.

Пры такім становішчы ўзьнікае сур'ёзная пагроза за выкананьне вызначанай праграмы будаўніцтва.

М. К.

ПАТРЭБНЫ ТЭРМІНОВЫЯ МЕРЫ

МАЗЫР. (Наш. кар.). Пастанова ўрадовых органаў аб пачатку будаўнічых работ з 1 красавіка у нас ня выканана, і будаўніцтва па нашай акрузе яшчэ не распачалося. Да гэтага часу яшчэ няма прамфінпляну па будаўніцтве, і толькі зараз прыступілі да яго складаньня. Дагавары з работадаўцамі не заключаны, календарныя пляны да гэтых часоў яшчэ ня складзены, да гэтага часу на многія набудовы няма праектаў. Усё гэта можа прывесьці да поўнага зрыву будаўнічых работ.

Дрэнная справа з цэглай, якую можна было сваячасова загатовіць. Але калі наш Камунальны трэст пачаў прыводзіць у парадак цагельню толькі з 15 красавіка, дык першую партыю цэглы можна чакаць толькі ў чэрвені-ліпені. Ня меншае галавацяпства праявіў у гэтым пытаньні і акрвыканком. Саюзныя органы яшчэ зімою ўзбудзілі хадайніцтва аб заводзе цэглы з іншых округ, бо наш завод ня зможа даць патрэбнай колькасьці цэглы. Але акрвыканком тады з гэтым не згадзіўся і толькі зараз, калі мы сталі перад фактам поўнай адсутнасьці цэглы, акрвыканком прышоў да заключэньня — увоз неабходны.

Камунальны трэст узяўся набудаваць цагельню ў Пятрыкове, але да гэтага часу не заключыў дагавору з будканторай. А мазырская цагельня знаходзіцца ў безгаспадарчым становішчы. Гофманская печ мае шчыліны, тачкі паламаны, нічога ня робіцца для рамонту.

Гліна (да 200 кубаў) знаходзіцца ля ямы, і падмываецца вадой.

Ва ўсіх раёнах таксама яшчэ не падрыхтаваліся да будаўнічага сэзону. Трэба выправіць пагражаючае становішча, якое стварылася.

М. В—к.

Забесьпячэньне сэзоньнікаў прадуктамі

(Ад нашага гомельскага карэспандэнта)

Падрыхтоўка да арганізацыі грамадзкага харчаваньня для сэзонных рабочых праходзіць пры недапушчальна вялым тэмпе. Тыя дырэктывы, што былі даны будаўнічым арганізацыям пра абсталяваньне сталовых на больш буйных будаўніцтвах, да гэтага дня ня выканаены. Такое становішча ставіць пад пагрозу нармальнае забесьпячэньне сэзоньнікаў. Асабліва трэба адзначыць поўную непадрыхтаванасьць да забесьпячэньня рабочых-будаўнікоў абедамі і гарачым сьнеданьнем на чыгунцы, шклобудзе і на торфараспрацоўках Гомельскае акругі.

Прэзыдыум акруговага праффбюро абавязаў усе будаўнічыя арганізацыі не пазьней 20 красавіка скончыць арганізацыю сталовых і буфетаў, а ГПК і ГСПС — правесьці ў гэтым часе ўзмоцненую праверку. Але ня ўсе прафсаюзы і ня ўсе прадпрыемствы ставяцца да гэтага з належнай увагай. Так, напрыклад, Гомельскі гарсавет, Гомельскае ГПО, Гомельскае ГПУ, Гомельскае ГОРО, Гомельскае ГОРФО, Гомельскае ГОРОНО, Гомельскае ГОРЗДРАВ, Гомельскае ГОРСОЦАБЕС, Гомельскае ГОРСОЦВОС, Гомельскае ГОРСОЦОБЕС, Гомельскае ГОРСОЦОБЕС, Гомельскае ГОРСОЦОБЕ

Антывялікодныя дні ў Менску

У дні «вялікодных» сьвят грамадзкія арганізацыі, саюзы і прадпрыемствы разгарнулі шырокую антывялікодную кампанію.

Белдаяржкіно за два тыдні да гэтых сьвят пачаў ставіць у менскіх кіно-тэатрах спэцыяльныя антырэлігійныя фільмы («Юда», «За ваша здароўе» і інш.). На клюбах таксама ставіліся антырэлігійныя кіно-фільмы.

Учора, а палове 12-й ночы, калі пачыналіся «усяночныя», Белдаяржкіно арганізавала пастаноўку кіно-фільмы на Плянцы Волі. Апрача таго, аўта-кіно-радыё-перасоўкі на раколіцах Менску таксама давалі кіно-сэансы.

Заводы правялі антывялікодную кампанію ўдарным парадкам. На заводзе «Энэргія» ўчора а 4 гадз. адбыўся антырэлігійны мітынг. Вечарам у клюбе пры заводзе быў зроблены даклад на антырэлігійную тэму і была пастаноўка. На «Эльводзе» ўчора адбыўся вечар з дакладам і пастаноўкай. Рабочыя «Эльводу» пастанавілі: ўсім выйсьці на работу на вялікдзень.

На гуце «Пралетары» па зьменах адбыліся лятучыя антырэлігійныя мітынгі. Учора вечарам адбылося адкрыцьцё летняга саду заводу, дзе быў зроблены даклад аб «крыжовым паходзе» і пастаноўка.

На заводзе «Бальшавік» па зьменах былі праведзены мітынгі. У клюбе гарбароў учора быў наладжаны вялікі антырэлігійны вечар з антырэлігійнай выстаўкай і праграмай.

На заводзе «Чырвоная Зорка» і хлебазаводзе сёньня выступяць клюбныя гурткі «сіняй блюзы» за спэцыяльнай антывялікоднай праграмай.

У клюбе дрэваапрацоўшчыкаў учора адбыўся грандыёзны вечар з пастаноўкай, дакладам і карнавалам. Апрача таго, саюз дрэваапрацоўшчыкаў паслаў у падпэфныя калгасы Заслаўскага раёну 30 культработнікаў свайго саюзу для правядзеньня антывялікоднай кампаніі.

Ўсебеларуская выстаўка застаецца без пажарнай аховы

З набліжэньнем лета паўстае сур'ёзнае пытаньне аб ахове с.-г. і прамысловай выстаўкі ад пажару тым больш, што амаль усе будынкі выстаўкі будуць пабудаваны з дрэва і на самой выстаўцы будзе шмат такіх матар'ялаў, як сена, салома і інш., якія лёгка загараюцца.

Пажарная-ж ахова пастаўлена зусім дрэнна. Ня гледзячы на неаднаразовыя прапановы і загады пажарнай аховы Менску ад прыняцьця неабходных супрацьпажарных мерапрыемстваў, на выстаўцы да гэтага часу няма нават самых элемэнтарных пажарных прылад. Так, на ўсёй тэрыторыі выстаўкі няма зусім пажарных рукавоў, ваданаправод працуе дрэнна і ня можа задаволіць поўную колькасьць патрэбнай вады, агнятушыцелі ёсьць у нездавальняючай колькасьці, пажарнага тэлефону няма.

Пажарная ахова на выстаўцы пастаўлена дрэнна, выстаўка ахоўваецца толькі міліцыянэрамі. Усяго-ж для выстаўкі патрэбна каля 20 пажарнікаў, якіх біржа працы ніяк ня можа даць. Цэнтральнае кіраўніцтва пажарнае аховы Менску выначае патрэбную колькасьць пажарнікаў са сваіх каманд, але НКП не дазваляе ім працаваць звыш нормы. У выніку ўсяго гэтага выстаўка застаецца без пажарнае аховы. Трэба ў самым тэрміновым парадку паклапаціцца і паставіць на належную вышыню пажарную ахову на выстаўцы.

Ал. МІРОНАЎ.

НА ПАБУДОВУ САМАЛЕТУ „НАШ АДКАЗ ПАПЕ ПІЮ XI"

Уносяць і выклікаюць

Рабочыя і сяляне вёскі і саўгасу Савічы, Капыльскага раёну, уносяць на пабудову самалёту «Наш адказ папе Пію XI» 27 руб.

***

На выклік тав. Рахубы тав. **Рубінчык Г. Б.** зямляўпарадкавацель Менакрэа ўносіць на пабудову самалёту «Рукі прэч ад СССР» — 5 руб. і выклікае наступных таварышоў з Менакрэа: **Трубенку В. І., Буцьвіловіча П. І., Красінскага, Бахера, Казака, Ганчарова, Цішкова** (старшыня РВК), **Якубовіча, Акуліча і ўсіх супрацоўнікаў Плешчаніцкага РВК.**

Раённы бацькаўскі сход ясель № 1, 3 і 7 уносіць на пабудову самалёту «Наш адказ папе Рымскаму» — 33 руб. і выклікае яслі № 2, 4, 5, 6, 8, 9, 10, 11, 12.

Да ведама падпісчыкаў „Зьвязды"

З сёньняшнім нумарам газэты „Зьвязда" рассылаецца дармовы дадатак— **ГАЗЭТА „ПРАФРУХ" № 8**

Падпісчыкі! Пры атрыманьні «Зьвязды» патрабуйце дадатак „ПРАФРУХ"

ЗАГАД

Асобнай Роты Сувязі 2-й Беларускай Стралковай імя т. Фрунзэ Дывізіі

16 красавіка 1930 г. Гор. Менск.

№ 4.

§ 1.

Усім пераменьнікам Асобнай Роты Сувязі—нараджэньня 903, 1904, 1905 і 1906 г. г., якія жывуць у г. Менску і прыгадной чарзе, ЗАГАДВАЮ: зьявіцца на перарэгістрацыю ў наступным парадку: 1) усім пераменьнікам членам саюзу металістых зьявіцца 21-га красавіка, а 18 гадзіне ў памяшканьне Штабу Роты (вул. Карла-Маркса, 42), 2) членам саюзу саўгандальслужачых—21-га красавіка, а 20-й гадзіне, 3) членам саюзу гарбароў, швейнікаў, харчавікоў, будаўнікоў, рабземлесу і іншым зьявіцца 22-га красавіка, а 18-й гадзіне.

При сябе мець пры сабе вучотна-вайсковыя кніжкі і членскія білеты прафсаюзаў.

УВАГА: Усе пераменьнікі, якія не зьяўляюцца членамі прафсаюзаў, а таксама беспрацоўныя павінны зьявіцца к вышэйпказанаму тэрміну. Усім прыгарадным сялянам мець на руках даведкі ад старшынь с.-с. аб маемасным становішчы, а таксама даведкі, калі ён зьяўляецца членам калгасу.

Камроты сувязі 2 ДРАЗДОЎ. Вайсковы камісар Р. С. АРЛОЎ.

ЗЬВЯЗДА.

Правілы прыёму

ў Магілеўскі палітасьветны тэхнікум на 1930-31 навуч. год

Палітасьветны тэхнікум мае на мэце падрыхтоўку культурных палітасьветняй кваліфікацыяй па асобных галінах базах, нардамох, клюбах, дамох культурных, хатах-чытальнях, бібліятэках, вясковых школах дарослых, 1-ай ступені, кіно-мэханікаў.

У адпаведнасьці з гэтым, пры тэхнікуме існуюць спэцыяльныя аддзяленьні:

1. Масавае культурна-палітасьветнае, якое рыхтуе працаўнікоў для культбаз, клюбаў, нардамоў, дамоў культуры, хатчытальнь.
2. Бібліятэчнае—бібпрацаўнікоў.
3. Школьна-курсавое—рыхтуе працаўнікоў для вячэрніх школ дарослых 1-ай ступені.
4. Палітасьветнікаў—кіно-мэханікаў для стацыянарных і перасовачных кіно.

Адпачасова па гэтых галінах, апрача кіно-мэханікаў, існуюць польскі і яўрэйскі сэктары, якія рыхтуюць працаўнікоў для абслугоўваньня нацыянальных меншасьцяй: яўрэяў, палякаў.

Прыём у палітасьветны тэхнікум праводзіцца на базе сямігодкі, вячэрніх рабочых школ павышанага тыпу, школ сялянскай моладзі, або спэцыяльных курсаў па падрыхтоўцы ў тэхнікумы.

У палітасьветны тэхнікум прымаюцца пераважна партыйцы і камсамольцы з рабочых, батракоў, калгасьнікаў і сялянбеднякоў і сераднякоў, якія маюць ня менш, як аднагадовы стаж актыўнай партыйнай, камсамольскай, або грамадзкай работы, ва ўзросьце ад 17 да 25 год.

УВАГА: 1. Беспартыйныя прымаюцца ў тэхнікум у ліку 10 проц. усяго набору з ліку паказаных груп, якія маюць ня менш, як 3-гадовы стаж актыўнай, палітасьветнай або грамадзкай працы.

2. Асобы, якія жывуць па непрацоўных прыбытак, пазбаўленыя выбарчых правоў, а таксама іх утрыманцы ў тэхнікум ня прымаюцца.

У тэхнікум ня прымаюцца асобы хворыя на заразныя, у тым ліку вэнэрычныя хваробы, нэўрастэнікі, хворыя на сухоты ў заціжнай форме і зусім фізычна-слабыя.

УВАГА: Інвалідзнасьць сама па сабе ня можа служыць перашкодай для паступленьня ў тэхнікум.

Паступаючыя ў палітасьветны тэхнікум павінны падаць на імя акруговых КП(б)Б, анкету, засьведчаную савецкімі і прафэсыянальнымі арганізацыямі; да анкеты далучыць наступныя дакументы: дакумант аб адносінах да вайсковай службы (для мужчын), аб асьвеце, аб сацыяльным і матар'яльным становішчы паступаючага і яго бацькоў, аб стане здароўя, аб выбарчым праве і характарыстыку аб грамадзкай працы.

УВАГА: 1. Сяляне, якія індывідуальна плацяць с.-г. падатак, прадстаўляюць копію акладнога лісту.

2. Анкету з дакумантамі ў горадзе і ў раёнах падаюць праз райкомы КП(б)Б.

Адбор і камандыраваньне ў тэхнікум праводзяць акруговыя камісіі, якія арганізаваны пры акругкомах КП(б)Б для адбору слухачоў у камвуз і саўпартшколу.

Праца адборачнай камісіі пры акругкомах КП(б)Б павінна быць скончана не пазьней 1-га чэрвеня.

Сьпісы на камандыраваных таварышоў дасылаюцца акругкомамі непасрэдна ў Магілеўскі палітасьветны тэхнікум не пазьней 15-га чэрвеня.

Для слаба-падрыхтаваных рабочых, батракоў і белнякоў арганізуюцца пры тэхнікуме падрыхтоўчыя курсы, аб часе працы якіх будзе паведамлена асобна.

Камандыраваныя ў палітасьветтэхнікум забясьпечваюцца з боку мясцовых арганізацый сродкамі на дарогу ў абодва канцы. Апрача таго, ім павінна быць выдана пэнсія за 2 тыдні наперад.

За няпрынятымі тэхнікумамі захоўваюцца пасады, якія яны раней займалі. Залічаныя ў тэхнікум таварышы забясьпечваюцца стыпэндыяй, харчаваньнем, пасьцельнай бялізнай, абмундзіраваньнем, падручнікамі і пісьмовымі прыладамі. Першы курс абмундзіраваньня грошы атрымлівае толькі з другога сэмэстру.

Тэхнікум не бярэ на сябе ніякіх абавязацельстваў наконт вызначэньня кватэр сем'ям студэнтаў.

Пры тэхнікуме складаецца прыймовая камісія, у якую ўваходзяць: дырэктар тэхнікуму (старшыня), прадстаўнікі аддзелу культпропу акругкому КП(б)Б і акругкому ЛКСМБ, акружнога праўленьня прафэсыянальных саюзаў, гарбюро пралетстуду, гарсавету, бюро калектыву КП(б)Б і інспэктар акрпалітасьветы.

Прыймовая камісія працуе з 1 па 15 жніўня. Заняткі пачынаюцца з 15 жніўня на старэйшых курсах і з 1 кастрычніка для прынятых сёлета.

Месцы на 1-шы курс тэхнікуму разьмеркаваны па асобных акругах у наступным парадку:

Менская—белсэктар—30, польсэктар—8 і яўсэктар—8; Віцебская—белсэктар—30, польсэктар—5 і яўсэктар—8; Гомельская—белсэктар—30, польсэктар—4 і яўсэктар—7; Магілеўская—белсэктар—30, польсэктар—4 і яўсэктар—6; Бабруйская—белсэктар—25, польсэктар—5 і яўсэктар—6; Аршанская—белсэктар—24, польсэктар—4 і яўсэктар—4; Мазырская—белсэктар—23, польсэктар—5 і яўсэктар—3 і Полацкая—белсэктар—23, польсэктар—5 і яўсэктар—3.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД ЦКК КП(б)Б

Партпройка ЦКК УсеКП(б) ад 24-га красавіка ў складзе т. т. **Ніканорава, Шкірыча і Рыскіна** пачне разгляд апэляцый на рашэньні ЦКК КП(б)Б на пытаньні чысткі. Разгляд апэляцый усталёўлены ў наступным парадку:

24-га красавіка будуць разглядацца апэляцыі наступных т. т.: Адзярэйкі Кастуся Мікалаевіча, Беларыцкага Мэфа Іцкавіча, Бацяна Цімаха Васільлевіча, Гаварухіна Мікалая Сымонавіча, Клябанава Майсея Давідавіча, Карачуна Уладзімера Яўхімавіча, Кроля Льва Саламонавіча, Лікума Альбэрта Эрнэставіча, Літвінава Апанаса Пракопавіча, Лібэрмана Язэпа Давідавіча, Паляшчука Трафіма Мікітавіча, Русовіча Ігната Ігнатавіча, Рудзенскага Антося Палікарпавіча, Хробата Вінцэся Вінцэсевіча, Шатэрніка Эфрэма Гарасімавіча, Харленкі Андрэя Тодаравіча, Харытончыка Аляксандра Рыгоравіча, Мельчанкі Мікалая Іванавіча, Зянькевіча Баляслава Мікалаевіча і Якімовіча Зьмітра Рыгоравіча.

25-га красавіка—Сапікава Андрэя Тодаравіча, Хвашнянскага Язэпа Сымонавіча, Когана Майсея Аўсеевіча, Катлова Емяльяна Андрэевіча, Паваркова Сяргея Сяргеевіча, Каваленкі Кузьмы Васільлевіча, Кірыленкава Піліпа Сьцяпанавіча, Кужалёва Льва Сьцяпанавіча, Халапенкі Маркі Кузьмічча, Бартковіча Эдуарда Пятровіча, Бакінаўскага Карла Леапольдавіча, Жолудзя Мірона Мітрафанавіча, Старадзьнава Сьцяпана Андрэевіча, Таптупова Сьцяпана Савасьцянавіча, Кандраценкі Хвядота Тодаравіча, Іофэ Карпэля Майсеевіча, Халькова Макара Яўменавіча, Макараўскага Георга Гарасімавіча, Камінскага Станіслава Язэпава, Плотнікава Мікалая Васільлевіча.

26-га красавіка—Чарняўскага Барыса Рыгоравіча, Міцкевіча Кастуся Арцем'явіча, Капчука Аляксандра Якубавіча, Савіткава Івана Васільлевіча, Бэмбэля Пятруся Баніфатавіча, Вялюгі Міхася Ігнатавіча, Конява Пракопа Антонавіча, Лукашука Мікіты Якімавіча, Палуйчыка Міхася Сьцяпанавіча, Каханчыка Івана Карпавіча, Кропгаўза Льва Давідавіча, Дамарацкага Міхася Іванавіча, Даўмана Фэлікса Раманэвіча, Лукошкі Мікалая Прохаранча, Караткевіча Івана Цытавіча, Вяржбіцкага Мацея Рыгоравіча, Тарасава Івана Ільліча, Бляхмана Захара Самуілавіча, Вайкаша Мікалая Самуілавіча, Чарнушэвіча Зьмітра Сілавіча, Гарухіна Зьмітра А., Ігнацюка Міхася Філіпавіча, Шакала Івана Георгавіча, Гарачуна Уладзімера Сільвэстравіча і Краўчанкі Івана Савасьцянавіча.

Просьба да ўсіх падаўшых апэляцыі таварышоў, якія пералічаны ў гэтым сьпісе, у паказаны тэрмін зьявіцца на пасяджэньне партройкі ЦКК УсеКП(б) па адрасе—Менск, Савецкая, 55, ЦКК КП(б)Б, РК і ячэйкам паклапаціцца, каб усе пералічаныя т. т. былі неадкладна паведамлены. Праезд за свой кошт.

Дом Камасьветы паведамляе, што сёньня, 20 красавіка, у пакоі № 19 адбудзецца кансультацыя для дакладчыкаў аб дні 1-га мая.

Павінны зьявіцца наступныя т. т.:

Ад Кастрычніцкага РК КП(б)Б. Наступныя таварышы прымацаваны да прадпрыемстваў для правядзеньня 1-га мая:

Ад БДУ: Каранеўскі—экспл. тав., Капаплін—да ДЭПО, Рыўлін—малы рамонт вагонаў, Сікерская—абутковая фабрыка, Сініцын—шчаціннная фабрыка, Голан—завод «Чырвоны Хэмік», Белькаў—малочны завод, Шаліма—чыгунка таварная, Цёмкін—чыг. пасаж.; ад НКЮ: Сташэўскі—вагон. майст., Міхайлаў—Скурсындыкат і Мар'ясіна—ЦІП; ад ВСНГ: Стракоўскі—зав. «Бальшавік» і Кейлін — «Чырвоная Зорка», Царонак (Белмяса)—бойня, Задаеў (эксп. пас.) — абутковая майстэрня, Рамізэвіч (ЦК ЛКСМБ)—УМТ, Эрэнбурґ—да сьпіртазаводу, Баркоўскі (акрпракуратура)—лямцавая фабрыка, Кугель (радыё-унівэрсытэт) — шкло-завод, Пыжыкаў (Валпаляводсаюз) —шчотачная ф-ка, Красоўскі (Белсельсаюз) — база Дзяржгандлю, Ліўшыц (НКЗ)—«Чырвоны Крыж», Багарат (малочны саюз)—палата мер і вагі, Жыгмунд (НКА)—спраўдом, Эфром—да Белсампрамсаюзу, Копелева—Белсампрамсаюз, Гайдук (Наркамсабез) — БСІКА, Эленаў—БСІКА і Нікольскі—да Белсампрамсаюзу.

Т. т. Розэнгауз, Яршоў, Хаскін, Галемшток, Вінаградаў, Палякоўскі, Гурло, Мазэлей, Дубравіцкі, Шолузаў і Рэзьнікава будуць накіраваны па пуцёўках АПА РК КП(б)Б.

Сьпіс дакладчыкаў для правядзеньня першамайскага сьвята па Фрунзэўскім раёне.

Ад камвузу: Ярмолін—завод «Пралетары», Лур'е—зав. «Беларусь», Буткевіч — «Чырвоны Тэкстыльшчык» і Аўчыньнікаў—ф-ка «Беларуска»; ад рэдакцыі «Зьвязда»: Мітлін—завод «Дрэваапрацоўшчык», Асьмоў — ф-ка «Кастрычнік» і Красьнеўскі—13-ты ЖАКТ; ад ЦСПСВ: Клімковіч—зав. «Камунар», Мірынгоф—п.-к. краўцоў і Рыжоў—Менгандальбуд; ад ЦК КП(б)Б: Канакоцін—Белдаяржбуд, Гурэвіч — Белдаяржбуд, Будзінскі—1-я друкарня, Хмялеўская—Белжыльсаюз; Гольдбэрг (Даяржплян)—ф-ка «Камунарка», Дунец (рэд. «Акцябр»)—ф-ка «Кастрычнік», Шукевіч-Трацьцякоў («Беларуская Вёска»)—шпалерная ф-ка, Джэлюк («Чырвоная Зьмена»)—Белдаяржбуд; ад СНК—Кузьняцоў—Менгандальбуд, Бэнэк—Эльвод, Гэйнэ—6-ты ЖАКТ; ад ЦВК: Сакольскі—футровая фабрыка, Ульляноў—1-я друкарня і Мачульскі—п.-к. абутнікаў, Абрамсон (Наркамгандаль) — Менгандальбуд, Сандлер (Белдаяржстрах)—хлебазавод, Савіцкі (Белдортранс)—п.-к. Паліграф; ад НКА: Галавач—кандытарская ф-ка і Некрашэвіч—друкарня «Зьвязды», Шастакоў (ЦСУ)—цагельні Белстромтрэсту, Грабузоў (Лесбел) — саюз будаўнікоў, Луцкевіч (Белпайгандаль) — аўтакіраўніцтва, Гнілякевіч (Наркампрацы) — каап. прадпр. харчавікоў; Сакалінскі (ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў)—рымарская ф-ка, Сьнежка (Металяўстановы)—Абкамтрэст; Стрэле (ЦСУ)—цэнтр. пажарная команда, Якаўлеў (рэд. газ. «Рабочий»)—ДЭТ; ад Белпэдтэхнікуму: Прусьліна—ЖАКТ № 1: Чарнецкі ЖАКТ № 3, Каган (Саюзхлеб) — ЖАКТ № 2, Чарот (БДВ)—ЖАКТ № 4. Казак (БАН)—ЖАКТ № 5, Грыцкевіч (Пралетстуд)—ЖАКТ № 12, Панаў (ВСНГБ)—ЖАКТ № 14, Кацэнэльсон (ЦСУ)—ЖАКТ № 18, Захарава (Наркампрацы)—ЖАКТ № 8; да прыгараднага сельсавету прымацоўваюцца: Улезла (бульбяная станцыя), Вайцаховіч і Маскоўў (Наркамзем), Папко (НК-РСІ), Серба (Дом Селяніна), Аскерка (ЦП саюзу с.-г. рабочых) і Бялян (Акрвыканком).

Усім ячэйкам трэба дагаварыцца з вылучанымі дакладчыкамі аб дні і часе сходу.

Савецкія ячэйкі вылучаюць дакладчыкаў самастойна.

СЁНЬНЯ

Пэдагбінэт. У 10 гадз.—канфэрэнцыя прыродаведаў. Разгляд новых праграм. — У 19 гадз.—канфэрэнцыя «0» груп. Разгляд новых праграм.

Фр. РК КП(б)Б. Пасядж. фракцыі Фрунз. РК МОПР'у. Пач. у 18 гадз. Яўка абавяз.

Пасядж. рэўкамісій яч. Фрунз. раён. савету Асоавіяхіму. Пач. у 18 гадз. у памяшк. РК КП(б)Б.

Пушкінская біб-ка. У 19 гадз. (1 паверх)—заняткі курсаў па падрыхтоўцы бібліятэкіранак і заг. перасовачных бібліятэк. Тэма: **камплектаваньне біб-кі.**

Клюб саўгандальслужачых. У 20 гадз. нарада культактыву і членаў мастацкіх гурткоў. Яўка абавязкова. Запрашаюцца радавыя члены саюзу саўгандальслужачых.

Кастрыч. РК КП(б)Б У 19 г. нарада ўпоўнаважаных «Правды» і «Бальшавіка». Яўка партупоўнаважаных ячэек—абавязкова і без спазьненьня.

Дом Асьветы. Вечар, прысьвечаны падагуленьню вынікаў 3-х месячніка пралетарскай беларускай і нацменаўпралетарскай культуры. Праграма вечару: даклад аб выніках 3-хмесячніка і мастацкая частка з удзелам слухачоў Музтэхнікуму. Білеты ў канц. Дому.

ЗАЎТРА

Дом Пісьменьніка (Савецкая, 68). Нарада заг. школ г. Менску. Пач. у 19 гадз. Парадак дня: аб узнагародзе лепшай школы пераходзячым сьцягам імя «Пионерской Правды». Прысутнасьць загадчыкаў абавязкова.

Бюро фізкультуры ЦСПСБ разам з АСФК склікае агульна-гарадзкую нараду фізкульт. актыву. Пач. у 19 гадз. у залі пасядж. ЦСПСБ. Парадак дня: аб летніх формах гурткоў. і мас. фізкультпрацы ў горадзе і ўдзеле фізкультурнікаў у першамайскім сьвяце. На нараду выклік. усе бюро ФК ЦП саюзаў, старшыні, старасты бюро гурткоў і фізкультактывы прафсаюзных, клюбн. вайск. і навуч. устаноў і ўсе інструктары фізкультуры Менску.

Сход таварыства эканамістых і аграрнікаў-марксыстых. Пач. у 19 гадз. у памяшк. камвузу. Парадак дня: спрачкі па дакладзе т. **Пінус** і заключнае слова.

Дом Працы (2-гі паверх, пак. № 2). Арганізац. пры БелМБІТ бюро садзейнічаньня завочн. тэх. навуч. склікае нараду слух. завоч. курсаў. Пач. у 19 гадз.

Пушкінская біб-ка. У 18 з пал. гадз. пасядж. бібліятэчнага савету. Яўка заг. бібліятэчных аддз. і прыгарадных хатчыт. абавяз. Запраш. прадст. ад прадпрыемстваў, якія карыстаюцца перасоўкамі ад Пушкінскай біб-кі.

Заля пасяджэньняў ЦСПСБ. У 18 гадз. сэктар вытворчасьці і заработнае платы склікае нашыр. нараду па пытаньні аб ходзе самаправеркі сац. спаборніцтва па Менскай акрузе. На нарадзе будуць заслуханы інфармацыі прадст. ФЗМК, вылучаных брыгадзіраў ЦСПСБ і МБІТ, наступных прадпрыемстваў: заводу «Энэргія», «Камунар», «Бальшавік», абутковай ф-кі, шклозаводу, «Пралетары», «Дрэваапрацоўшчык» мясцкому № 1, вагонных майстэрань таварн., мясцкому № 3 пасажыр. і дэпо таварн., ф-кі «Кастрычнік», заводу «Дамбаль» і «Чырвонае Бярэзіны» (Барысаў). Запраш. прадст. ВСНГБ, ЦК ЛКСМБ, прадстаўнікі ЦП саюзаў і рэдакцый газэт.

Ад камісіі па чыстцы апарату МЦРК. З 19-га красавіка ў хаце-чытальні імя Дзям'яна Беднага (рог Камароўскай і Савецкай вул. радам з аптэкай) праходзяць чыстку працаўнікі крам №№: 11, 34, 48, 56, 67, 82, 101, 115, 126, 160, 171, 175, 176, ларкі 14 і 15 і буфэты №№ 46 і 50. Просьба да пайшчыкаў і працаўнікоў крам прыняць удзел у чыстцы.

27-га красавіка Тураўскі РК КП (б)Б склікае раённую нараду селькораў і рэдкалегій насьценных газэт з наступным парадкам дня:

1. Чарговыя задачы рабселькораўскага руху ў раёне.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

СЬЦЯГІ да 1-майскіх сьвят

ПРАДАЮЦЦА ў ТАВАРЫСТВЕ „Прыхільнік дзяцей" —Савецкая, 40, і ў магазыне т-ва—Ленінская, 26.

IV Пленум ЦК МОПР БССР

АДКРЫВАЕЦЦА 21-га красавіка, а 6 г. увеч., у памяшканьні ЦК МОПР БССР (Савецкая, 87).

ПАРАДАК ДНЯ ПЛЕНУМУ:

1. Справаздача прэзыдыуму ЦК МОПР БССР (дакл. т. Славінскі). 2. Аб новых формах і мэтадах работы (дакл. тав. Калмык). 3. Даклад Магілеўскага АК МОПР'у. 4. Аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі (дакл. т. Левін). 5. Бягучыя справы.

Сакратар ЦК МОПР БССР **Калмык.**

Пашыраная нарада вытворчых ячэек МОПР'у г. Менску.

Клюб Працасьветы Аўтораў, 22 красавіка

Менскі Акруговы камітэт МОПР'у

—) СКЛІКАЕ (—

агульна-гарадзкую пашыраную нараду вытворчых ячэек МОПР'у

Парадак дня: 1. Даклад аб новых формах і мэтадах работы ў рэканструкцыйны пэрыяд—дакл. тав. КАЛМЫК. 2. Аб удзеле ў сьвяткаваньні 1-га Мая.

На нараду павінны зьявіцца ўсе члены бюро калектываў, цэхавых і зьменавых ячэек, зборшчыкі членскіх узносаў і члены рэвізійных камісій.

Уваход па білетах, разасланых па ячэйках | Пасьля нарады—новы мопраўскі кіно-фільм „Брацтва здалёку" | Запрашаюцца члены ФЗМК і культкамісіі

Пачатак роўна а 7 гадз. увеч. — Менскі Акруговы Камітэт МОПР'у.

ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ

22 красавіка а 8 гадз. увечары ў памяшканьні клюбу «Саўгандальслужачы» склікае

МІТЫНГ-ЗЬЛЁТ УСІХ ВЫЛУЧЭНЦАЎ,

што працуюць ва Ўстановах гор. Менску, якія аб'яднаны саюзам саўгандальслужачых

На гэты мітынг абавязкова яўка вылучэнцаў, старшынь МК і кіраўнікоў устаноў. Запрашаюцца для ўдзелу ў мітынгу рабочыя, якія шэфствуюць над установамі, а таксама ўсе члены саюзу саўгандальслужачых.

На мітынгу рапартуюць МК: ЦРК, ВСНГ і ЯКФ аб становішчы вылучэнства, умовах працы вылучэнцаў і інш., а таксама рапартуюць па аднаму вылучэнцу: Дз'ржгандбелу, ЦРК і ЦСК аб умовах іх працы.

КІНО-ТЭАТР Культура

Мастацкі фільм вытворчасьці Савкіно **ПАКІНУТЫ ВОСТРАЎ** у 6 част.

Звыш праграмы кіно-хроніка Савкіно № 16

Пач. дзен. сэанс. 1 гадз., 3 г. 20 м.

Каса з 12 г. дня.

Пач. вечэрн. сэанс. а 7 г. Каса ад 5 г. увеч.

На дзенныя сэансы цэны ад 15 к. да 85 к.

Толькі 3 дні: 18, 19 і 20 красавіка

Мастацкі фільм вытворч. Савкіно

ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ кіно хроніка САВКІНО

Дзенныя сэансы: 1 г. 30 м., 3 гадз.

На дзенныя сэансы ўсе білеты па 25 коп.

Каса ад 12 гадз. дня.

Вечэрнія сэансы: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 20 м.

Каса ад 5 гадз.

КІНО Пралетары

2 фільмы ў адзін сэанс 2

1. Палітасьветны фільм **ЗА ВАША ЗДАРОЎЕ** у 8 част.

У галоўных ролях: **Чысьцякоў і Блюмэнталь-Тамарына.**

2. Замежная навэла **Цёмны канёк** у 2 частках.

Пач. 1-га сэансу а 7 г. Каса з 6 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр Ю-ны Піянэр

МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

паводле тэмы апавяданьня **Янры Барбюса „Здань, якая не вадочаецца"**

мэлядрама ў 7 частках.

Пач. 1-га сэансу а 2 гадз., 2-га—3 г. 30 м.

Каса адчынена ад 12 гадз.

КІНО Спартак

Нямецкі балявік 2-е ЖЫЦЬЦЁ

драма ў 7 частках.

Пачатак 1-га сэансу а 7 г., 2-га—а 9 г., 3-га—а 10 г. 45 м.

Каса—ад 5 г. 30 м.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР

Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Сёньня, 20 красавіка для чл. т-ва Саматужнікаў

Б. Лаўрэноў. РАЗЛОМ

п'еса ў 4-х дзеях.

Рэшта білетаў у касе тэатру. **Пачатак а 8 гадз.**

ГЭТЫМІ ДНЯМІ

ХТО? ВІНАВАТЫ?

Сачэце за рэклямай!

СКОРА МАСТАЦКІ ФІЛЬМ АРМЕНКІНО

ЗАМАЛУ

(МОСТ ПРАЗ БЯЗДОНЬНЕ)

Рэжысэр І. ПЕРАСЬЦІНІ.

НАВІНКІ ПАСТУПІЛІ У ПРОДАЖ

Бібліятэка бязбожніка.

МІТРАПОЛЬСКІ.—**Хэмія ў антырэлігійнай прапагандзе.** Стар. 63. Цана 28 кап.

Бібліятэка агітатара.

Супроць рэлігіі. Стар. 112. Цана 30 кап.

А. КОСАРАЎ. — **Камсамол у барацьбе за лінію партыі.** Стар. 40. Цана 12 кап.

Работа рабкораў і рэдкалегій. Асноўныя палажэньні, зацьверджаныя 4-ю Усесаюзнаю нарадаю рабселькораў. Стар. 118. Цана 45 кап.

Па фабрыках і заводах.

Воўна. Стар. 78. Цана 26 кап.

Бібліятэка школьніка.

Шолом-Алэйхэм.—**ХЛОПЧЫК МОТКА,** апавяданьне. Стар. 146. Цана 40 кап.

Кніжкі прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ, ЦРК і БКС і можна выпісваць праз Кніга-Поштай: Менск, Цэнтральная Кнігарня БДВ.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА.

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЮ ПАТРЭБНЫ ДЛЯ РАБОТЫ Ў КІРАЎНІЦТВЕ

ІНЖЫНЭР-будаўнік
ІНЖЫНЭР-мэханік
ІНЖЫНЭР па плянаваньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і абмену вопытам,
ІНЖЫНЭР па плянаваньні вытворчасьці,
ІНЖЫНЭР па ліцэйнай справе,
ІНЖЫНЭР па прафасьвеце,
ІНЖЫНЭР па тэхніцы бясьпечнасьці і аховы працы,
ТЭХНІК-будаўнік,
ТЭХНІК па тэхніцы нармаваньня
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў с.-г. машын і мэт. вырабаў,
ЭКАНАМІСТЫ па групе заводаў машына-будаўніцтва

АПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ.

Прашэньні накіроўваць на адрасе: Менск, Рокіцкая, 8, Белмэталяаб'яднаньню, тэлефоны: 10-21, 10-33, 15-79.

БЕЛМЭТАЛЯАБ'ЯДНАНЬНЕ.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДНЫМІ КАСАМІ БССР

абвяшчае, што з 15 красавіка г. г. пачалася

ПРАДАЖА ВЭЛЁСЫПЭДНЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ,

выпушчаных Усесаюзным аб'яднаньнем машынабудаўнічай прамысловасьці, згодна пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ад 26 сакавіка г. г.,

рэалізацыя якіх ускладзена на АШЧАДНЫЯ КАСЫ.

Усіх вэлёсыпэдных абавязацельстваў выпушчана 350 тысяч, з якіх БССР прадстаўлена 7525.

КОШТ ВЭЛЁСЫПЭДУ УСТАНОЎЛЕН У 160 РУБ.

Абавязацельствы выпускаюцца ў 4 сэрыі:

Тэрмін абавязацельства I сэрыі —1 красавіка 1931 г.
« « II « —1 жніўня 1931 г.
« « III « —1 красавіка 1932 г.
« « IV « —1 жніўня 1932 г.

Аплачваюцца абавязацельствы ў РАСТЭРМІНОЎКУ.

Падпісчыкам абавязацельстваў даецца права аплачваць кошт вэлёсыпэду ПОЎМЕСЯЧНЫМІ, МЕСЯЧНЫМІ АБО КВАРТАЛЬНЫМІ (3-х месячнымі) узносамі ў строга вызначаных сумах, у залежнасьці ад сэрыі абавязацельстваў. На сумы, унесеныя для аплаты абавязацельстваў, налічваецца ў карысьць уласьнікаў абавязацельстваў 6 проц. гадавых. Пасьля поўнай аплаты абавязацельстваў уласьнікі іх неадкладна атрымліваюць са складу «ДЗЯРЖШВЭЙМАШЫНЫ» НА РУКІ ВЭЛЁСЫПЭД (выпуску маскоўскага, пензенскага або харкаўскага заводаў)

Падпіска прымаецца ва ўсіх ашчадных касах (акрэмя агенцый) і філіялаў Дзяржбанку ў межах вызначанай колькасьці вэлёсыпэдаў, прадстаўленай кожнай касе.

Падпіска прымаецца індывідуальная і калектыўная ад асобных калектываў рабочых і служачых і членаў калгасаў.

Вэлёсыпэды выключна МУЖЧЫНСКІЯ.

Абавязацельствы прадаюцца толькі працоўным. Кожны падпісчык мае права толькі на адно вэлёсыпэднае абавязацельства.

Падпіска на вэлёсыпэдныя абавязацельствы заканчваецца 1 ліпеня 1930 г.

**Кіраўніцтва ашчаднасамі